Вячаслаў Хілімонаў

# ДЗЁННІК ПАРТЫЗАНА

*Дзённікавыя запісы — каштоўная знаходка.*

*Для свайго часу мо і глупства, і драбяза, але з цягам часу звычайная оптыка мяняецца: важнае для аднаго часу сыходзіць раптам на другі план, робіцца звычайным, а нейкая дробная агаворка, выпадковая фраза робіцца фактам, нечае згаданае прозвішча пачынае сведчыць, падказваць і расшыфроўваць.*

*Прыватныя дзённікі ператвараюцца ў важныя документы гісторыі. Яны знаёмяць з многімі забытымі падзеямі, людзьмі з мінулага, кідаюць цень і праліваюць святло на іх біяграфіі, пашыраючы межы нашага ўяўлвння пра ўжо забытае, дапамагаюць рэстаўраваць падзеі ўжо ў новай праекцыі.*

*Малады партызан Вячаслаў Хілімонаў вёў дзённік, які стаўу ваенныя гады яго самавыяўленнем, а мо ратаваннем.*

*Захоўваецца арфаграфія і пунктуацыя аўтара.*



Вячаслаў Халімонаў

**Лагер. 3 мая, панядзелак. 1943 года.**

Свята 1-га мая мы правялі як можа быць лепш па-ваеннаму. Наш атрад[1] увесь сеў на коні. Першамайскі мітынг быў на Святусе. Наш атрад і Камсамольская брыгада. Парад прымаў камбрыг. После чаго наш атрад у баявой гатоўнасці выехаў на вёскі. Праязджалі праз Новае Сяло, Пагарэлку, Быковічы, Ярэмічы, Вобрыну, Даўгінава, Кашчыца двор — адкуль паслалі пару снарадаў і мін у Турэц, нам тожа адказалі некалькімі. Аказваецца, ад нашых снарадаў траіх параніла, дваіх цяжка. Ды яшчэ і певень паляцеў угору так, што і пер'я ад яго не знайшлі. Паліцаі ігралі ў сетку (валейбол).

[1] Атрад пад камандаваннем Міцькі (Дзмітрыя Дзенісенкі) — адзін з атрадаў Баранавіцкага партызанскага злучэння, створанага на тэрыторыі акупаванай Баранавіцкай вобласці ў пачатку красавіка 1943 года паводле рашэння Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б, першым сакратаром якога быў Васіль Яфімавіч Чарнышоў. Ён жа камандаваў Баранавіцкім партызанскім злучэннем пад мянушкай «Платон».

Потым падаліся на Лядкі, Слабаду, Бярозавец, Тарасавічы і зноў у Слабаду. У Слабадзе начавалі, гулялі іігралі. У Бярозаўцы нас хацелі абстраляць з Карэліч немцы — карны атрад нібыта туды прыехаў. Цяпер наш атрад выглядае прыгожа: усе апранутыя ў зялёныя халаты і пілоткі. Нібы які вайсковы полк.

**Лагер. 16 мая. 1943 года.**

Мы ўжо пара дзён, як на новым месцы. Паколькі першы лагер быў у лесе высокі, то гэты размяшчаецца ў кусціках. Будкі зрабілі хутка — за гадзіны тры. І вось наш «гарадок» гатовы. І ўжо тут здарыліся ў мяне непрыемнасці: коні былі ўцяклі з нашага ўзвода, чацвёра якіх ледзь злавілі ў Новым Сяле. А яшчэ тут водзяцца вужы і гадзюкі, так што можна часам і паспаць разам з імі.

Пазаўчора нашы тры ўзводы ездзілі на гаспадарчую аперацыю ў Заполле і там іх абстралялі з кулямётаў з-за школы. І яны ўцяклі, кінуўшы коні і вазы — усё. А 12 коней верхавых разам з сёдламі прапала. Нашых сіла была немалая, немцаў, расказваюць, было куды менш. Але ж гэта былі немцы, не «бобікі». Нашаму камандзіру ды ўсім нам гэта вялікая непрыемнасць. Мы задумалі адпомсціць ім на Карэлічах і, здаецца, сёння паедзем у бой.

Сёння да нас прыбылі яшчэ хлопцы з Вялікай Слабады: Коля Хончын, Валодзя Лісік, Косця Бірохалкаў і Валодзя Шасцелікаў. А з аперацыі з Заполля не вярнуўся Марцінеўскі — можа, збег у паліцыю? Бо па ім І на гэта можна было спадзявацца.

**Лагер. 19 мая. 1943 года.**

Толькі што прыехалі з баявое аперацыі. Былі ў Заполлі, Ляску, Красным, рабілі засаду на карэліцкіх паліцаяў. Гэта мелася быць помета за нядаўнюю засаду на нашы ўзводы, якія з сораму пабеглі тады. Але паліцаі не з'явіліся, а мы дарэмна здорава памерзлі.

Учора быў сход атрада, тэма вядомая: узмацненне дысцыпліны. У канцы сходу быў зачытаны загад камісарам атрада (нядаўна ў нас назначаны былы дагэтуль начальнік штаба атрада Лёнька, як мы яго тут проста называем, Фанышаў) аб расстрэле збегшага ў той няўдалай аперацыі Марцінеўскага. Мусіць, паляк ён, ці што? Ён выдаў паліцыі распалажэнне нашага лагера, а вінтоўку закапаў, сам хаваўся. А што будзе з яго сям'ёю — невядома. Гэта ж не хаханькі — усё зводзіцца да жыцця ці смерці. Ды не аднаго, а сотні чалавек.

Хутка трэба будзе нарад прымаць, дык іду спаць яшчэ, хоць крыху. І думаецца: кусаюцца немцы, хочуць, мабыць, зрабіць блакіроўку нашай пушчы. Нядаўна бамбілі іх самалёты лясы паміж Навагрудкам і Баранавічамі.

**Лагер. 24 мая. 1943 г.**

Учора была нядзеля — сумная нядзеля для нашага атрада. У суботу сполудня мы разам з Камсамольскай брыгадай выехалі на баявую аперацыю ў нейкія Дудкі — вёску за 25 км ад нас, распаложаную дзесьці за Стоўбцамі. Там быў гарнізон з паліцаямі і каля 30 нямецкімі афіцэрамі. У Зубараве зрабілі адпачынак, а самы былі галодныя, як ваўкі. Каля 1-х гадзін ночы былі на месцы, у зыходным палажэнні. Пасля белай ракеты адкрылі ўраганны агонь па пастарунку, з усіх бакоў.

Чуваць было толькі агульны гул. Білі з гарматак — нашай і брыгаднай, «працавалі» кулямёты «максімы», з іх два — данілаўцаў. Немцы кідалі ракеты: чырвоныя, зялёныя, белыя... мабыць, прасілі паратунку са Стоўбцаў.

А мы хутка пайшлі ў атаку. Па жыце, якое ўжо вырасла па пояс чалавеку. Без устанку марусіў дождлжык, і мы былі ўжо зусім мокрыя. У мяне ў ботах, ды і ва ўсіх было поўна вады, якая абцякала з мокрага жыта. Дабраліся да дротавай загароды. Пачалі ламаць калы і секчы лапатамі дрот. Немцы пачалі ўжо нас абстрэльваць, але білі чорт ведае куды. Мы ішлі ва ўвесь рост. Я то, прызнацца, часам і прыпадаў на зямлю, ад чаго мне і цяпер сорамна самому перад сабою. Ды і ў атаку падняўся не першым. Гэта ўжо потым асвойваўся ды ішоў уперад як мае быць.

Нарэшце ўлезлі ў іх акопы. Былі ў іх і дзоты — мураваныя, халера. Тут затрымаліся. Побач з намі аказаліся камандзір і камісар нашага атрада, а да пастарунку было зусім блізка. Немцы пачалі адбівацца гранатамі, а будынак пастарунка ўсё не гарэў. Аказалася, што камбрыг Камсамольскай брыгады забараніў як адказны за аперацыю, падпальваць будынак.

Аўтаматчыкі кінуліся ўперад, як наш камандзір крыкнуў, што Лёню — камісара — забілі. Узяліся яго адносіць, а разам і аднаго аўтаматчыка з брыгады. Мы адышлі ў жыта, бо ўжо нікога не было каля пастарунка. Заляглі каля прысад, але ў бой ужо не ўступалі. Потым рушылі ў вёску. Тады ўжо і немцы пачалі страляць па нас. Але ў нас адзін і быў забіты, а ў брыгадзе таксама адзін і трох параніла. Нам усім вельмі шкада свайго камісара.

Раніцай паселі на коні і вярнуліся ў сваё

распалажэнне. А пад вечар на Добрачы хавалі Лёньку. Добры чалавек быў, смелы, але ў баю «цвярозы». З камандзірам ён добрую пару састаўпяў. Ды вось жа трэба, каб так непрадбачна і неспадзявана загінуў. Цяпер камандзіру без яго будзе значна цяжэй, хаця ён і стараецца не паказаць гэтага па сабе. Ну, што ж: сумуй не сумуй, а змагацца І жыць далей трэба.

Учора прыехалі з «раёна» ў пушчу фрунзенцы. Расказвалі, што злавілі нямецкага шэфа паліцыі. Такі тлусты — каля 10 пудоў вагою. Дык ён прызнаўся, што быў загад паліць вёскі ў Мірскім, Карэліцкім і Гарадзішчанскім раёнах. Ды яны гэтага немца вазілі па спаленых вёсках, і калі хто хацеў, мог яго выцяць.

**Лагер. 29 мая.**

Мы на новым месцы, больш выгадным для нас. Замаскіраванае ад самалётаў, аб чым ужо неабходна паклапаціцца цяпер, бо і такая пагроза ўжо існуе. Перабірацца з месца на месца мы ўжо ўмеем хутка: снедалі на старым месцы, а абедалі ўжо на новым у сваіх «хатах».

Сёння ноччу былі на гаспадарчай аперацыі ў Шчорсах. Яна была зроблена спецыяльна як помета за другую аперацыю Шэўкі, якая была няўдалай. «Бамбілі» спакойна, паліцаі толькі ракеты пускалі. Ужо калі ад'язджалі, дык далі крыху па пастарунку: адзін снарад, адна міна, а я выпусціў усяго 3 патроны. Паліцаі ж нават не адазваліся. У Каледзінай бачылі камету, вялікая ляцела, але па дарозе згарэла. Рэдкая з'ява!

У Тунісе зліквідавалі ўжо нямецкія войскі каля 13 мая. А у нас у пушчу пераехалі «фрунзенцы», якіх мы хадзілі ў Крынкі сустракаць. У нашым атрадзе

ствараецца зноў пяхота, намячаецца рота. Камандзір яе — дзядзька з вусамі, «чапаевец», камандзіры аддзяленняў Федзя Салянік і Паўлаша Сярдзюк. Я у сваім узводзе аддзялённы, але Макей (камандзір узвода) нешта крыўпяецца.

Сумна, што зацішша на франтах. Пачну пісаць у газету «Чырвоная звязда», што выходзіць пры камандаванні пушчай.

**7.06.43 г.** Сёння туманная раніца, але цёплая. Усё ж свістам птушак поўніцца лес. А ў лагеры цішыня. Я толькі што прыехаў з дому. Там я змяніў бялізну, трохі выпілі, ну а я трохі «ухажваў» за Нінаю Л. Мы праводзілі час прыемна і спакойна, адным словам, культурна. А ў гэты ж час у лесе адбываліся падзеі.

З вечара ўчора ў Каледзіную прыехала са Шчорса паліцыя, нібыта з бронемашынамі ці нават і танкеткаю. Наш атрад быў на нагах і хутка быў на месцы бою; у самой Каледзінай нашы тры партызаны абстралялі паліцыю, а калі наш камандзір кінуў ракету, дык паліцаі кінуліся хто куды. Беглі нават на балоты, гэтак, як мы іншы раз ад іх беглі.

А на Добрачы ўжо раніца. Федзя Ватолін, камандзір другога ўзвода, будучы у сільнай гарачцы (ён хварэе на брушны тыф), пачаў страляць з дзясяткі ў Сашу Дахно, нашага фельдшара. Яму адарвала два пальцы і параніла твар, спадзяюцца, што будзе жыць, але палучаецца, застанецца калекам.

Учора нямецкі самалёт раскідваў лістоўкі, у якіх паведамляюцца пастановы нямецкіх акупацыйных улад за подпісам Розенберга. Змест іх коратка пераказаў Павел Сініца з Новага сяла, што «прызнаецца ўласнікам

на зямлю і на гаспадарку той, хто ваюе супраць бальшавізму». Гэта, вядома, не навіна, і ад гэтай паперкі нясе нудой. Бадай мала хто з нашых людзей паверыць усяму гэтаму. Ёсць чуткі, што сем'і паліцэйскіх і немцаў выедуць адсюль. І нібыта тое, што на 10-га абвешчана мабілізацыя беларусаў да 40 гадоў узросту. Людзі недаверліва глядзяць на яе, і наогул атрымліваецца проста смешна.

**8.06.43 год.**

Група Кліменкі вярнулася. Амаль ды і пэўна нічога яна не зрабіла. Расказваюць толькі, што нашай братвы партызан многа ўсюды. Цікавы факт, што скора будуць ствaрацца польскія партызанскія атрады. Яны будуць добра ўзброены: ПЛД — аўтаматамі, кулямётамі. Носяць польскую вайсковую форму з пагонамі, на рагатыўках белыя арлы. Заўважаецца рост польскіх атрадаў: з вёсак ідуць да іх 30—50 чалавек; там, дзе жывуць палякі-каталікі. Многія паліцаі пераходзяць да іх. Як бы яно там ні было, а да нас, савецкіх партызан, цяпер польскія жыхары адносяцца добра. Як далей будзе — хіба сам чорт ведае. Каб не давялося яшчэ нам і з імі ваяваць?!

**Лагер. 20 чэрвеня 1943 года.**

Учора перажылі мы проста сенсацыйны вечар, а лепш сказаць — ноч. Атрад збіраўся ехаць на раён ганяць «чыжыкаў», калі з Каледзіной паведамілі, што злавілі шпіёна, нейкага Бумая Пятра. Наша рота пяхоты пайшла па свайму заданию, а кавалерысты паехалі ў Каледзіную. Потым мне Іван Смалянка расказваў пра ўсю гэтую гісторыю — ён там «карначом» быў.

Дык вось гэты самы Пётр Бумай з'яўляецца родным

братам Валодзі Бумая са Шчорсаў, які раней уцёк з Камсамольскага атрада. Аказваецца, сустрэўся з партызанамі нашага атрада. І каб паведаміць нам, што брат у 12 гадзін ночы будзе чакаць партызан пад мастом ля Шчорс. Ён будзе ў чорнай вопратцы, без шапкі, будзе мець пры сабе 2 гранаты і пісталет. Выходзіць, што гэты Валодзя Бумай пасля таго, як уцёк з партызанаў, паступіў у нямецкую школу шпіянажа СД, а брат Пеця быў у атрадзе СС. Цяпер Валодзя хоча нешта паведаміць нашаму атраду.

Узвод Шэўкі паехаў у Каледзіную і выслаў да маста сваіх людзей;. Вскорасці і прывялі Валодзю Бумая. Я змог да яго толькі прыгледзецца, калі ён з камандзірам выходзіў з хаты. Той самы Бумай, які вучыўся ў Навагрудскай сярэдняй школе пры Саветах, як і я, і быў актыўным камсамольцам. Губы надзьмутыя, а вочы, здаецца, так і смяюцца іранічна, хаця я іх і не бачыў. Да чаго дакаціўся, сволач!

Цікава, што ж ён паведаміў камандаванню атрада? Пакуль што гэта трымаецца ў таямніцы. Рабяты здагадваюцца толькі ці мо падслухалі, што ён нешта пра самалёты гаварыў, што будуць лятаць над лесам, але яны будуць небраніраваныя, таму па іх можна і страляць. А камандзір атрада прагаварыўся, што якогасьці шпіёна ў партызанах дапрошваць будзе. Усё гэта можа быць праўдай і няпраўдай, але факт, што нешта важнае ён усё ж сказаў.

Абодвух Бумаёў адвялі ў Каледзіную і пусцілі ў Шчорсы, як, відаць, было і дамоўлена. Справа, канешне, цікавая: пусціўся Бумай на вялікія справы. Але як з іх выбрыдзе? З яго боку тут альбо вялікая гульня, каб ашукаць іх, альбо з немцамі настолькі кепска, што яму

ўжо не было іншага выхаду, як рызыкнуць і прыслужыцца партызанам і гэткім спосабам выратаваць сваё жыццё. Што ж, пабачым, чым яно кончыцца.

**Лагер. 23.06.1943 год.**

Учора выпусцілі першы нумар насценнай газеты нашага атрада і камсамольскай арганізацыі п. зг. «Красный конник». Слабы нумар, але ж першы. Тым не менш, сярод рабят ураженне нядрэннае засталося. Увесь нумар запоўніў Кліменка, які цяпер у нас камісарам атрада. «Пярун» (камандзір гарматкі ПТО) і Сярдзюк Паўлуша аформілі старонку гумару. Усё гэта на рускай мове. У мяне была думка напісаць артыкул на беларускай мове аб нашай пярвічнай камсамольскай арганізацыі, ды не было ўжо месца. Таксама думаў і Міша Караіга. На другі раз падрыхтуемся лепш.

Валодзя Бумай, відаць, паведаміў нешта пра наступление немцаў на нашу пушчу. Бо мост свой мы развялі на плоціку, дарогі пазавальвалі дрэвамі, самі сядзім у лагеры. Ёсць чуткі, што ў Турэц панаехала многа немцаў. Слабада была ўчора зусім бязлюдная, людзі падаліся хто куды.

Чытаю цяпер кніжкі «Северные рассказы» Дж. Лондана на рускай мове і «Людзі з воску» Эвы Шальбург-Зарамбіны на польскай мове.

На фронце па газетах ніякіх перамен. А ўчора цэлы дзень лыталі нямецкія самалёты і да полудня недзе нешта грукацела. Нямецкія лістоўкі ўсё больш бесяцца і ўсё больш хаэтычныя, без ніякага сэнсу. Надыходзіць, мусіць, гарачая пара для іх.

А ў нас на палях пачынае шарэць ужо жыта, паднялася ярына. Проста не верыцца, што людзям не да

гэтых родных ніў. І што дома яны могуць быць толькі ноччу і то «на чыку». Трывожна і сумна.

Мне ўжо становіцца недастаткова гэтай газетнай пісаніны ў насценгазету, каб што пасур'ёзней. Але спадзяюся яшчэ папрацаваць, калі толькі не хлопнуць. Сёння мо куды паедзем...

**Лагер. 29.06.43 года.**

Быў агульны сход атрада. Прысвойвалі вайсковыя званні. Колі Савіну прысвоілі сяржанта, Кеду Уладзіміру — старшага сяржанта, Смалянка Івану — малодшага сяржанта. А Сашу Пашкова за п'янку звольнілі з камандзіра ўзвода разведкі, а на яго месца назначай Кеда.

**Блакаднае лета 20.07.1943. Бакшты (Налібоцкая пушча)**

Вось жа не думаў, што аж сюды мяне занясе ваеннай віхурай. А куды яшчэ закіне — невядома. А пачалося ўсё з Вялікай Слабады. Карнікі яе захапілі, і мы з імі біліся за Новае Сяло. Гэта было у сераду 13.07, а мо і 14.07, добра і не помню, бо мы ўжо ў тэты дзень біліся за Добрач. Я са сваім узводам абараняў наш стары лагер і пільнаваў, каб карнікі з другога боку Добрачы не пераправіліся цераз Нёман. 15.VII зноў ішоў бой за Добрач. А з абеду — адступленне, бо немцы пераправіліся цераз Нёман каля Шчорсаў, прарваліся да Кроманя і нам пагражала акружэнне. А пэўна і мо што горшае. Гэта было, здаецца, у суботу. Пасля чаго пачалося «вандраванне» па пушчы, па балотах, пераправы цераз рэчкі.

З ядой неважнецка, і гэта пакуль самае слабое месца нашага становішча. Першы наш план быў, каб

прарвацца каля Іў'я ў раёны, у тыл блакадзе. Сёння, відаць, ён перамяніўся, бо вяртаемся назад, мабыць, таму, што І тут ужо немцы ёсць, якія занялі Нікалаева, Любчу. Спярша думалася, што гэтыя зграі немцаў, украінцаў і іншай сволачы ідуць на фронт, а па дарозе робяць гаспадарчыя аперацыі, запасаюцца прадуктамі. Па лесе швэндаюцца, а галоўнае для іх — прайсці усімі ляснымі дарогамі і папаліць усе вёскі і хутары ў лесе.

Ёсць і другая думка, што гэта спецыяльная блакада пушчы, мэта якой — загнаць усіх партызан у «мяшок» і потым на іх пусціць газ. Якая з іх больш правільная — будзем бачыць. Хаця ні ад адной нам не лягчэй.

З нашага месца распалажэння вестак ніякіх. А там столькі людзей засталося, і мая сям'я там, Іван з жонкай і дачкою, маці, Ліда і Шура на гэтым баку Нёмана, у пушчы. Можа, ужо і нежывая. Бацька на другім баку, у вёсцы застаўся. Яшчэ менш надзеі, што жывы застанецца. За сэрца шкрабе ад гэтых думак, і ўсё ж нейкая надзея не пакідае: а вось выжывуць, ды яшчэ і ўбачымся... на гэтым свеце.

У мяне самога таксама дрэнныя справы. Боты рвуцца так, што скора босым стану, пінжак І штаны таксама з дзіркамі. Адным словам — незайздросна. Добра І тое, што хоць галава цэлая, а з ёю потым усё будзе.

**Лес. 27.07.1943 г., аўторак.**

Пасля паўтарасутачнага пераходу па балотах і цераз рэчкі мы зноў «дома». Але і тут хваліцца няма чым. Узяць хоць бы мяне. Бялізны не зменьваў больш як два тыдні. Ад хваробы, канешне, не выздаравеў, а захварэў яшчэ больш. Адзін бот амаль зусім разваліўся, з адзення

фрэнч і штаны толькі, а дождж не перастае ліць, есці таксама няма, хлеба ні крошкі, затое ёсць грыбы сырыя ды крыху солі. Так што загартоўка выпала някепская. Затое немцам — шыш з макам, імкнуліся нас акружыць і знішчыць, ды не атрымалася ў іх. Наш атрад увесь цэлы, праўда, коні толькі страцілі. Апе гэта справа нажытая.

Тут, аказваецца, паліцыя раз'язджае, трапляе нават і ў пушчу. Учора немцы грымелі там, над Галымі балотамі. На нас пусцілі франтавікоў, якія нядрэнна робяць сваю чорную справу. Але мы не трацім надзеі, сваё мы яшчэ пакажам. Няхай толькі рэгулярныя войскі адыдуць, тады мы зноў будзем біць гадаў. Вось і на фронце справы палепшыліся. Пасля нямецкага наступления цяпер у наступление пайшлі Саветы. Прарвалі фронт каля Арла. Нядаўна чытаў паведамленне: Арол акружаны з трох бакоў.

І вельмі трывожыць душу, а што ж сталася з сям'ёю? А тут яшчэ гэтыя жоравы са сваім працяглым жаласным крыкам! Мабыць, і ім блакада не падабаецца, мо і іх карнікі прагналі са сваіх гняздоў'яў? Ды і лета падыходзіць да канца. У полі і на сенакосах шмат чаго не зроблена. А калі было рабіць усё гэта?!

У нас трохі рабят адбілася ад атрада: у маім аддзяленні трое — Брасалін, Васілеўскі, Бандарык. Дзе яны цяпер, ці хаця жывыя? Ды што тут зробіш — такое яно партызанскае наша жыццё.

Пішу гэта на калене пад хвойкаю і ў дождж.

**Лагер. 29.07.1943.**

Памыліўся я, калі перад гэтым пісаў, што мы ўжо «дома». Да яго было яшчэ меней 20 кіламетраў. Але сёння вось ужо чацвёрты дзень, як мы ў сваім раёне.

Жыццё тут адразу перамянілася. Учора быў першы дзень у новым распалажэнні. У старым — нявесела! Конскія трупы: маю «варашылаўку» немцы застрэлілі. Ёсць і людзі мёртвыя: камандзір застрэліў Шавейку і Чхонава, якія груба парушылі дысцыпліну.

Учора адбыўся агульны сход партызан нашага атрада, на якім была зроблена перафарміроўка яго састава. Цяпер у нас няма ўжо роты, а ўсе падзелены на ўзводы. Змяніўся і камандны састаў. Камісарам назначаны капітан Грачанічанка, Кліменка — начальнікам разведкі, Пашкоў — камандзірам 1-га узвода, Шэўка — 4-га ўзвода, Кеда — 3-га ўзвода, Макей пайшоў у адстаўку. Небарака моцна перажывае, але яму і не мяшае, бо ўжо занадта распанеў. Камандзірам аддзялення ў нашым першым узводзе назначаны Міша Карвіга і Алік Чачотка, Савін — памочнік кам. узвода.

Мінулай ноччу група нашых партызан хадзіла ў Вялікую Слабаду. Дык там даведаліся, што карэліцкая паліцыя разбірае ў вёсцы будынкі партызанскіх сем'яў, і наша гумно разабралі і вывезлі, Буглаковых і Матрунцовых усё забралі, Курашовых спалілі, адна хата засталася, у Лейкавых забралі коней. Але ў некаторых нічога не чапаюць. Больш таго, гавораць, што паліцай Гімпель (ён учора начаваў у Слабадзе) некаторых хлопаў па плячы і гаварыў: «Не бойся, усё будзе ў парадку». Гэтак было з Хончынымі і Бірохалкавымі, ды і Карпавы не лепшыя.

Збожжа жаць партызанскім сем'ям не даюць. Мой адзін бацька дома ў Слабадзе, а астатнія сямейнікі ў Антанёве. А тыя, што не баяліся і аставаліся ў Слабадзе, дык нават нібы на партызан і забыліся. Ім жа даказвалі, што нам, партызанам, канец. Што Міцьку, нашага

камандзіра, забілі, а ўсе брыгады разагнаны і знішчаны. І многія гэтаму паверылі, бо вельмі ж ужо многа і моцна стралялі ў пушчы. Але сёння ўжо яны пераканаліся, што гэта няпраўда, што іх ашуквалі. Марозік — «д...н» дык нават уцёк у Турэц, бо разам з паліцыяй гарэлку піў, як ішла блакада. А наогул, людзі застрашаны, баяцца. Паліцаі ездзяць па вёсках па некалькі чалавек і ганяюць людзей, каб аддавалі ім дабро партызанскіх сем'яў, забіраюць іх коні і каровы.

На поўнач ад нас, гавораць, што гэта ў Валожынскіх лясах, яшчэ чуваць грукат. А на нашым фронце немцы адступаюць. Нібыта Смаленск узяты нашымі, Арол акружаны. Нібыта ў нямецкай газеце напісана, што яны «скарацілі» фронт. У Францыі нібыта высаджаны дэсант.

**Лагер. 03.VIII.43 г., аўторак.**

Учора наш узвод быў у нарадзе, г. зн. нёс ахову лагера. І я стаяў на пасту. 8 гадзін у суткі — трохі час доўжыцца. Затое клопатаў менш на галаве. А сёння я ўжо «старшы» над хворымі і босымі. Наша разведка паведаміла, што ў суботу карнікі выехалі з Кляцішч, дык многія з атрада пайшлі адшукоўваць свае седлы, якія ў час абстрэлу пакінулі. А ў лагеры засталіся тыя, якія не могуць ісці ці каму няма чаго ісці.

Нарэшце і надвор'е выдалася цудоўнае — горача, як і павінна быць летам. На палях людзі жнуць, толькі нашы сем'і — хто дзе. Самы сезон на чорныя ягады, а іх тут мноства. І ў кожнага з нас рот чорны ад іх. А наша жыта жне Даша-«бежанка», бацька украдкам ёй дапамагае, а мо і Шура.

Тут партызаны зноў пачалі дзейнічаць. Кажуць, на

Сэрвачы мост разбуралі ўжо восем разоў. Яшчэ кажуць, што карнікі сюдою будуць ісці яшчэ раз, вяртацца назад з пушчы. А мы ўсё ж ліпень пераражылі, а які будзе жнівень?

**25 августа 1943 г.**

Тут я на пасту. Пагода цудоўная, горача, людзей мала відаць на нашым баку, на другім на сенакосе многа, а ў вёсцы... Лагер. Лясная рэспубліка пабудавалася, жыццё пацякло. З ранку за Карэлічамі вывезлі многа людзей у Нямеччыну, пасля чаго карны атрад украінцаў выехаў з іншых месцаў. Мы ў новым лагеры...

**Пост № 1. 2.IX.43 год.**

Зусім восеньскі дзень: пахмурна, то дожджык пройдзе, а раніцай доўга стаіць туман. Я стаю на пасту, настрой якісьці ўзняты, здаецца, вось цяпер бы з ахвотай працаваў. Але канца вайны не відаць. Палтава, мусіць, не ўзята нашымі войскамі, узята толькі чыгуначная станцыя Любацін, што ў 20—25 км на захад ад Харкава. І ўсё ж Чырвоная Армія ідзе ўперад.

Учора зусім вечарам хавалі Андрушку Сучко з Быковіч. Харошы быў хлопец і смелы партызан. Быў паранены І ад ран памёр. А пахаванне было чыста партызанскае. Вершы ці паэму можна складаць па іх. Над магілай прамаўляў Царук Уладзімір Зянонавіч, які прыехаў з Жухавіцкай брыгады. Ён трохі ікаецца.

**Лагер. 4.IX.43 год.**

Нам вязе ў апошні час на пахаванні, учора хавалі зноў. Гэтым разам даўно чаканага пакойніка — «дзядзю Мішу». Я з ім добра жыў, хоць ён і быў чалавек строгі. А сапраўднае яго прозвішча Міхаіл Бойка. Сам ён з

Запалля, здаецца, прыехаў туды з Расіі на лета, тут і застала яго вайна. Пакінуў жонку і падлетка сына Барыса. Яны таксама тут, у лесе, становішча іх цяпер незайздроснае.

Учора атрымалі свежыя газеты, якія прывёз самалёт з-за фронта. Дык па зводках Таганрог узяты і там акружаны нямецкія войскі. А ўсіх было іх там да 35 тысяч. Смаленск нібыта абыходзяць бокам з поўдня. Зрабілі нашы войскі глыбокія прарывы — углыбіню да 60 км і па фронце да 100 км. Узялі нашы і горад Ельню. Мо гэта зроблен нажым на нашым адрэзку фронта. Зразумела, мы гэтаму рады, марым, калі закончыцца вайна.

Учора вечарам каля вогнішча Цеслякоў расказваў пра свае «паходжанні» ў нямецкім пляну пад Ленінградам. Цікава-то цікава, але і страшна. Хоць ты пішы пра гэта кніжку.

**Раніца на Добрачы. Пост № 3, 10.IX.43 года.**

Ноччу ішоў вялікі дождж, а з Турца стралялі з кулямётаў і кідалі міны. Вядома, гэта стралялі па партызанах. Ці не па нашых толькі, што паехалі ў Лыкавічы на гаспадарчую аперацыю. Мая сям'я выехала ўчора за Нёман дамоў, хаця дарога і не зусім спакойная.

Чуць свет я змяніў на пасту Кумца. На Добрачы ўсе яшчэ спалі. Разглядзеўшыся навокал: сумны від маюць гэтыя руіны спаленага карнікамі раней нябрыдкага пасёлка, цяпер суцэльныя руіны, а новыя будоўлі — будкі яшчэ сумнейшыя.

Але вось памаленьку пачынае прабуджацца жыццё. Першым выйшаў са свайго сховішча Быліч — бацька. Агледзеў столь на хлебапякарні і, мабыць, застаўся

задаволены, што праз пясок на ім не працякае вада. Гэта яго работа. А ўчора яшчэ нашы Іван і Шура працавалі тут.

Я ўспомніў, што сёння павінна была пачацца новая блакада. Ды вось жа ціха. Быліч толькі ўсміхнуўся, калі я сказаў яму пра гэта. Потым прыехаў старшыня, наш «дзелавы» Валодзя Смалянка, аглядаў пякарню. Неўзабаве пачалі «вылазіць» і другія жыхары Добрачы са сваіх куткоў, распальвалі кастры, нешта рыхтавалі сабе на снеданне. Вось выйшлі Фаня і Макар, апранутыя нібы на свята. Яна — у белай хустачцы, у боціках, нібы якаясь «пенсіянерка з пансіянату», з кошыкам... Нібы ў горадзе на рынак пайшлі па закупы. Ён — бадай у лагер падаўся, а яна — капаць бульбу. Цікавая гісторыя з гэтым Макарам — улюбіўся, новую сям'ю стварылі.

Буглак выгнаў наша стада кароў на сенакос. Прыехалі тры ярэміцкія партызаны з «раёна». Царук Л. прывёз масла і яблыкі. Адным і мяне частаваў. Затрымаліся каля адной будкі, мабыць, Будалёвай. Коні пусцілі пасвіцца.

Пачаўся новы партызанскі дзень.

**Лагер. 15.IX.43 года.**

Наш атрад дзейнічаў на раёне з суботы П.IX. Вярнуўшыся, у абед было агульнае пастраенне, дзе і быў зачытаны акт камісіі аб расследаванні пабегу Раковіча і Шэўкі. Як аказалася, яны былі ў Баранавічах, ды нібыта адтуль уцяклі, пачалі хавацца. Гэта такое становішча — хавацца ад ўсіх. Гэта — страшна!

Наш атрад абнаўляецца. Сабраны кулямёт «Максім», і пад яго тачанка з брычкі падроблена. Яны, таксама і гарматка, і мінамёт, памаляваны на зялёны і

выглядаюць, як новыя. А я ўсё ніяк не зраблю сядла.

Наш атрад не зявае. Ноччу з суботы на нядзелю ім спалена збожжа ў Кашчычавым дварэ, нарыхтаванае для немцаў. З нядзелі на панядзелак ужо Карэлічы не спалі. Адразу быў спалены мост на Сэрвачы, потым пабывалі ў Працяневіцкім двары, а Коля Савін падпаліў дзве хаты ў саміх Карэлічах. З Карэліч стралялі, за Савіным гналіся паліцаі на самаходзе з «Максімам».

Цікавая справа з Гімпелем — слабодскім паліцаем і нашым палонным. Дагэтуль ён быў пад наглядам, а ў суботу далі ўжо і вінтоўку (мусіць, кавалку байка ў яго вінтоўцы не хапала) і патроны. Быў вельмі рады і паехаў разам з партызанамі. Казалі, што паліў збожжа ў Кашчыца заядла. Потым нашы спалілі яшчэ раз мост на Ушы і ўчора адпачывалі ў Качанах. Але не драмала і паліцыя. Турэцкая з-пад Турца, а Мірская з Пясочнае і Ушы пачала абстрэльваць наш атрад. Атрад адступіў на Загора і толькі аднаго каня забілі. А ўчора па абедзе атрад ужо быў «дома», на Добрачы.

Весткі са свету і з франтоў прыемныя. Італія капітулявала 9 верасня. На савецкім фронце поспехі Чырвонай Арміі таксама парадачныя. Заняты гор. Сталіна і вобласць, а таксама

Марыўпаль, Канатоп, Чарліно, г. зн. нашы войскі падыходзяць к Дняпру. За 13-е ў зводцы гаворыцца, што нашымі ўзята прадмесце горада Бранска. Ой, хутчэй бы гэтай вайне «капут»!

**Лагер. 16.IX.43 г.**

Як нашы людзі баяцца немцаў-акупантаў, сведчыць такі выпадак. 16. IX. хтосьці з партызанскіх сем'яў касіў на тым баку Нёмана траву і заўважыў у кусце бабу, якая

хавалася і ўцякала ад яго. Наш карнач (начальнік каравула) на Добрачы таксама заўважыў гэта і выслаў туды разведку. Аказалася, што гэта была Шуры Грабановага-Скока жонка Маня Серадова з Пагарэлкі. Уцякала яна ад немцаў перад блакадай і дабегла толькі да Нёмана і схавалася ў кустах, не паспеўшы перапраўіцца цераз рэчку ў пушчу. Кармілася шчаўем і нават травою, жыла так амаль 9 тыдняў, сніла многа сноў і думала, што навокал яе ўсё яшчэ немцы. Добра пазнае ўсіх, мяне пазнала адразу, усіх называе далікатна: «Вечычак», «Колічак» і г.д. Яе прывялі на Добрач, пасадзілі пры кастры.

— Божа, мой Божа! — усё ўздыхае яна. — Як добра пачуць сваю мову і пачуць, што бальшавікі едуць!

Гэта яна сказала пасля таго, як прачыталі ёй зводку з фронту. Выгляд яе, як у нябожчыка, худая, высахла ўся, толькі скулы сінія тырчаць на твары. Жывы нябожчык!

**Лагер. 28.IX.43 года.**

Маня Серадова ўчора паехала дамоў. Тут яе ратавалі як маглі, і яна ўжо крыху ачуняла. Але цяпер тут стала небяспечна жыць. Вось ужо чатыры разы нямецкі бамбардзіроўшчык прылятаў сюды і бамбіў то Каледзіную, то Антанёва ды і старыя лагеры партызанскія. Учора дык асабліва быў раз'юшаны: увесь дзень лёталі над лесам на змену. Добрачы не бамбіў, мабыць, нічога не прыкмеціў. Ён нас не адшукае, а мы яго ашукалі. Сёння спадзяваліся, што ён зноў прыляціць, ды надвор'е, мабыць, перашкаджае. Дробны дожджык марусіць, ды і туман навокал, і ночы ўжо даволі сцюдзёныя.

Сёння ноччу недзе ў напрамку Баранавіч і Ліды два

разы чуліся ўзрывы, мабыць, бамбілі. Весткі з франтоў радуюць: узяты Саветамі Чарнігаў і Палтава. Неафіцыйна гаворыцца пра вызваленне Смаленска, Оршы і Кіева.

Мы выпусцілі другі нумар нашай насценгазеты «Красный коннік», у якім майго матэрыяла няма, але ў трэці я падрыхтываў верш, а мо і песню «Особый казачий отряд».

Сёння ўвесь дзень недзе грукоча: што і хто — незразумела.

**3.10.43 год.**

Яшчэ адзін месяц пражылі, ды і нягорш нават. А нас ужо цікавіць гэты месяц — кастрычнік. Няўжо і ён не вырашыць нашага лёсу?! На фронце нашы войскі падышлі да Дняпра, тут — узялі Смаленск. Гэта афіцыяльна. Цяжкім будзе для савецкіх войск гэты рубеж — Днепр, ды немцы ў сваіх газетах усё талдычаць пра моцную абарону на Дняпры.

*22. 9.* у Мінску забілі Кубэ, нямецкага правіцеля Беларусі. За гэта, гавораць, у Мінску выразалі насельніцтва двух вуліц.

Учора атрад вярнуўся з раёна. Ужо перастаў лётаць над пушчай нямецкі бамбардзіроўшчык «зялёная жаба», як назваў яго Андрушка Лушнікаў. Чатыры дні ўсё круціўся над лесам. Лятаў і над нашым лагерам, бамбіў зімнія лагеры «камсамольцаў». У Антанёве забіў 3 каровы і некалькі ў Ціхове. Камандзір наш шкадуе добрых людзей: адну карову замяніў чалавеку на параненую, бо ён аддаў нам сваю карову ў блакаду.

*30. 9.* ці *1. 10.* памерла Люся, дачка старэйшага майго брата Івана. Такая разумненькая дзяўчынка была: калі хаваліся ў блакаду ў пушчы, дык не плакала, што

есці вельма хочацца; разумела дзяўчынка, што калі заплача, то накліча смерць і на сябе, і на іншых. Цярпела ўсё: ела сырую бульбу, галадала, усяк перажывала. А тут — на табе! Шкада дзяўчынку! Шкада як чалавека, а колькі ж іх памірае цяпер? Вось чаго забыць ніколі нельга будзе!

Учора паліцыя (чорт яе ведае, якая яна ўжо) страляла па Быковічах, кідала міны. Але ўсё гэта толькі «страхі на ляхі». А да «золатаўцаў» перайшла група з чыгуначнай аховы з шасцю кулямётамі і «максімам». А ў нас сядзіць служака з СД, якога нашы злавілі ў Каледзінай і які ішоў разам з рабочымі дамоў у Слонімскі раён. Гаворыць, што ўцёк з Мінска, хутчэй за ўсё, шпіён.

У нас жа паміж партызан найчасцей ідзе гаворка пра тое, як хутка вызваліць нас Чырвоная Армія. Выйшаў і трэці нумар нашай насценгазеты, у якой таксама майго матэрыялу няма.

**Баявая восень 43-га. Лагер. 07.10.43 года.**

Толькі што прыехаў з Федзем Салянікам са Слабады. Ён ездзіў у Вялетава па хлеб, а я яму дапамагаў. А потым мы ўхажывалі — ён з Нінай, я з Анютай. Якое там «ухажванне», от правялі ноч. Анюта жыве каля Негніч, а сюды прыйшла дапамагаць сястры капаць бульбу. Нічога сабе дзяўчына, але збіраецца ўжо ісці дамоў, бо вельмі пастрашыў яе нямецкі самалёт, які бамбіў Быковічы. Кінуў восем бомбаў і запаліў некалькі будынкаў, аднаго чалавека параніў. Ноччу сёння шмат чырвоных ракет відаць было лявее Стоўбцаў, і ляталі самалёты. Чые — невядома.

На фронце нашы падышлі да Віцебска, Оршы, Гомеля, Магілёва, занялі прадмесці Кіева і

Днепрапятроўска. Наогул жа фронт затрымаўся на Дняпры. Немцы ходзяць у контратакі, але гэта ўжо ніякага значэння не мае. Мо да Кастрычніцкіх свят фронт і да нас дакоціцца.

Сядло ў мяне ўжо ёсць, цяпер яшчэ каня і... хопіць займацца «абломаўшчынай»!

**Лагер. 25.10.43 года.**

Раніца. Нямала новых падзей адбылося за гэты час, якія я не запісаў сюды. Адбылося некалькі эпізодаў у нашым раёне. Учора ў Вялікай Слабадзе была засада немцаў і паліцыі, мусіць, з Міра. Заадно яны рабавалі сялян у Тарасавічах, Вялетава нібыта не чапалі. А у нас быў бой з гэтымі «груганамі», як мы іх называем. Нібыта сам Фэст (нямецкі гаспадарчы камендант Мірскага раёна) арганізаваў гэтую «аперацыю» па вывазу збожжа з Новага Сяла. У абед нашы два ўзводы і гарматка занялі ўскраек леса ад гэтай вёскі. Пачалі іх абстрэльваць, і яны пусцілі па нас некалькі мін, потым пачалі адпраўляць абоз з трохі нарабаваным збожжам і пусты. Наш Коля Васюцінскі — камандзір гарматкі — страляў па іх абозе даволі метка, а потым і Даніла з Камсамольскага адкрыў агонь па іх абозе, які пад'язджаў да Пагарэлкі. Абоз павярнуў на Лядкі, па дарозе кідаючы снапы збожжа і бульбу. Тады нашы два конныя ўзводы паімчаліся за імі. Пакінуўшы коні ў яміне пры дарозе, пешша пачалі наступаць на Лядкі. А 1-ы наш узвод конна паімчаўся на Браносава, каб адрэзаць грабежнікам адступленне на Турэц. Па іх стралялі з кулямётаў і мінамётаў. За імі ўслед паскакаў і 4-ы ўзвод, а з Лядак іх ўжо выбілі.

Атрад начаваў у Вялікай Слабадзе, а на світанку выехалі на засады: 1-ы ўзвод у Новае Сяло, 3-і застаўся ў

В. Слабадзе, 4-ы — у Тарасавічах. З засадак нічога не атрымалася, грабежнікі больш не прыйшлі. Мы зняліся з засад і толькі паехалі да Немана, як два нямецкія сцярвятнікі бамбілі Слабаду і Тарасавічы. У Слабадзе спалілі 32 хаты.



Вячаслаў Хілімонаў. Германия, 1945 год.

**Лагер. 30.X.43 год.**

Яшчэ адзін месяц застаўся за намі. Мы не толькі цэлыя і здаровыя, але і атрымліваем перамогі. Сёння нашай групе аўтаматчыкаў удалася засада ў Новым Сяле. Нашы 12 партызанаў падпусцілі ўсутыч калону немцаў і паліцаяў і рэзанулі па іх з аўтаматаў і гарматкі. Ад яе снарадаў ляцелі ўгору і іх рукі і ногі ды і цалікам, як гаварыў пра гэта камандзір. А гарматка наша працавала, як аўтаматычная. Тут нават думалі, што гэта нямецкая.

«Іх нібыта было больш 300 чалавек, а болей трыццаці лягло іх там. Вось так і ваюем».

**Лагер. 7.11.43.**

Сёння ноччу выпаў снег, але цяпер ужо растаў. Нядаўна мы вярнуліся з парада, які правялі сумесна з брыгадай імя Жукава. Камандаваў парадам наш камісар. Пасля парада наш атрад выехаў на баявую аперацыю ў Нягневічы. Паліцыю загналі ў падвал, а самі праводзілі гаспадарчую аперацыю. У нас ужо склалася такая мода: прадукты мы дабываем у варожых гарнізонах. А ўчора да нас перайшоў паліцай з Любчанскага гарнізона. Сам ён са Шчорсаў, з «мураванкі».

Ужо даволі холадна. Два дні, а сёння трэці, як у нас ціха. Але перад гэтым немцы і паліцыя хацелі на нас напасці. Нейкі нямецкі маёр Беранд (мы яго празвалі «Бедны») атрымаў задание разбіць наш атрад. Перш яны рабавалі Новае Сяло, ды мы іх адтуль пагналі. А як уцёк ад нас Гімпель (былы паліцай са Слабады) ды мабыць рассказаў пра нас, і яны, «крумкачы», былі памкнуліся напасці на нашу пераправу. Але мы далі ім належны адпор: чатырох забілі, адзін з іх нават пакінуў сваю каску, поўную крыві, гранаты, патроны, вінтоўку. Яны ўцяклі, забраўшы забітых, і потым пусцілі па нас тры снарады, якія не прычынілі нам ніякай шкоды.

Але праз дзень яны зноў уварваліся ў Новае Сяло, відаць, той самы Бедны, пачалі абстрэльваць з марціркі. Людзей толькі настрашылі, але шкоды ніякай не прычынілі, лес толькі пакалашмацілі. Цяпер нібыта немцы ў Мір ад'ехалі, мо ў Баранавічы, адзін

Серафімовіч[2] са сваім карным атрадам застаўся. Збожжа, нарабаванае ў сялян, малоцяць у Турцы.

На франтах поспехі нашых войск, пераважна на поўдні. Крым «адрэзаны», там засталіся 136 тысяч варожых ваякаў, пераважна румын. Але гаворацць, што наступление нашых войск затрымалася.

Ужо нядзелі дзве, як мяне назначылі нам. камісара атрада па-камсамолу. Чытаю цікавую кніжку «Паўстанне» М. Паслядовіча. Пра вайну з белапалякамі ў1920 годзе.

**13.11.1943 года, субота.**

Другі дзень, як ідзе снег. Учора ён ляжаў поўны дзень. І сёння ідзе. На партызанскім «фронце» зацішша. Гавораць, што мірская паліцыя манаткі свае сабірае, а турэцкая — на ваенным палажэнні.

Атрымаў я даклад Сталіна за 07. 11., пачынаю знаёміцца.

Сям'я мая пераехала на Добрач, адзін бацька застаўся ў Слабадзе. Зрабілі ўжо невялічкую хатку. Я пазнаёміўся нядаўна з рэдактарам раённай падпольнай газеты Стаўбцоўскага раёна «Голас селяніна». Хачу напісаць у нашу насценгазету нешта пра Ваню «Куліка» (гэта яго мянушка) ды і паказаць гэтаму рэдактару, мо змесціць і ў сваім «Голасе».

---

[2] Сямён Серафімавіч, камендант паліцыі мястэчка Мір, прымаў удзел у карных аперацыях над мірнымі жыхарамі Мірскага і Карэліцкага раёнаў, у 1944 г. эміграваў у Англію. У расійскай пісьменніцы Л. Уліцкай ў яе кнізе «Даніэль Штайн, перакладчык» беларускі калабарант, карнік згадваецца як Сямёнавіч. Прататы- пам галоўнага літаратурнага героя кнігі выступав кармеліт, брат Даніэль Руфайзен, ён даваў паказанні супраць Серафімовіча ў лонданскім судзе ў 1993 годзе.

**«Дома»[3]. 28.11.43 года.**

У мяне цяпер «бумажная» работа. Вось ужо другі дзень друкуем з начальнікам штаба франтавыя зводкі, якія потым раздаём партызанам, каб яны распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва. Так, у нашым штабе ёсць «пишущая машинка», а заадно і савецкія песні. Няхай «хлопцы» не забываюць ды спяваюць.

Трэцюю ноч я начую «дома», г. зн. у сямейнай зямлянцы на Добрачы. Але заўтра ўжо перайду ў новы наш лагер, дзе перавезены і пастаўлены сапраўдныя хаты. У новым лагеры, канешне, будзе нам лепш. І цёпла, і відна.

Я рыхтуюся ўступіць у УКП(б). А разам працую над апавяданнем «Яго каханне», раніцай напісаў верш для нашай насценгазеты «Особый казачий отряд», а потым... потым і аповесць трэба напісаць пра партызанскую лясную «рэспубліку». Чытаю В. Ясенева «Солнечная Сторона».

Нарэшце і ў беларускім напрамку на фронце рух. 26.XI. узяты Гомель, 27.XI. — Ельск.

У нас на раёне пакуль ціха, але нядаўна атрад быў на раёне, дзе біліся з паліцаямі ўТарасавічах, Вялетаве і каля Некрашэвіч.

**31.2.43 года. Ноч.**

Больш месяца не запісваў я ў гэты дзённік, хаця, вядома, розныя падзеі адбываліся ў нас. Толькі, мабыць, не такія важныя. А вось гэты запіс раблю хутчэй дзеля таго, каб развітацца са «старым» годам. Хутка настане

[3] «Дома» — сямейны лагер, там жа і шпіталь, дзе можна адляжац ца, адпачыць, падлячыцца.

«новы».

Цяпер у нас ужо зусім зіма. Праўда, снегу малавата ды і марозік невялікі. Бадай, было б лепш, каб было наадварот — акупанты не вылазілі б са сваіх нор. А вечар сёння сапраўды прыгожы: цёплы, ясны і ціхі. Хлопцы, як хто можа, гуляюць, а я вось трохі хварэю: зубы баляць, ды на нагах чыры не загойваюцца. А яшчэ заўтра ў нас будзе агульны камсамольскі сход, за які я адказваю. Будзе мая справаздача, дык трэба падрыхтавацца.

У мінулым месяцы я шмат разоў пабываў у «раёне». Нават наведаў і некалькі вёсак «Фрунзенскага» раёна. Праводзіў сходы з насельніцтвам, пераважна з моладдзю, з якіх ствараў падпольныя арганізацыі. Работа гэта складаная і адказная, але мне падабаецца. Я цяпер ужо не толькі сакратар нашай камсамольскай арганізацыі, але і член Мірскага падпольнага РК ЛКСМБ. Учора адчытваўся перад сакратаром ЦК ЛКСМБ, які прыязджаў у міжрайцэнтр разам з Платонам (першым сакратаром Баранавіцкага падпольнага абкама партыі). А ў нашым атрадзе Платон быў 29.12. Мо і збіраўся Платон нас папракаць, але атрымалася так, што больш хваліў. Ён абяцаў нават прысвоіць нашаму камандзіру званне падпалкоўніка, а наш атрад пераіменаваць у 1-ю Беларускую кавалерыйскую партызанскую брыгаду. Гэта будзе здорава!

На франтах поспехі. Падышлі пад Полацк і зноў пад Житомір. Можа, гэта ўжо зімовая кампанія пачалася? Неабходна адзначыць, што адбылася канферэнцыя Сталіна, Рузвельта і Чэрчыля ўТэгеране.

Я з 26.12. кандыдат УКП(б), прымалі мяне разам з камандзірам атрада. Чытаю кніжку «Клятва» — пра барацьбу аднаго атрада ў Фінляндыі ў 20-21 гг.

З сям'ёю ўсё ў парадку, толькі баяцца блакады. Са школ з гарадоў вучні вярнуліся дамоў, вучоба іх закончылася. Немцам такіх вучоных не патрэбна.

Вось з чым і сустракаю новы 1944 год. Якім жа ён будзе?

**2 студзеня 1944 года.**

Я — хворы: зубы баляць і ногі. Учора атрад выехаў на раён, я застаўся ў лагеры. Сёння «камсамольцы» былі паніку паднялі: маўляў, у Ярэмічах паліцыя... чалавек пад 250. Як потым аказалася — гэта быў наш атрад.

Камсамольскі сход учора праходзіў бурна. Прысутнічалі на ім камандзір з камісарам. Выступалі. Было пакрыху ўсяго: і крытыкавалі, ды і добрага ў нас нямала. Канешне, трэба яшчэ лепш працаваць, ды і ахвота ёсць. Вядома, аўтарытэт трэба заваяваць, з неба не зваліцца. А для мяне — тым больш.

На фронце наступление нашых войск у раёне Невеля і на поўдзень ад Жытоміра, а сам горад узяты другі раз 29.12., на гэты раз, пэўна, ужо назаўсёды.

**Лагер. 05.01.1944 года.**

Я сёння дзяжурны па гарнізону. Сам амаль калека і хворы, такія ж і часавыя. Атрад на раёне. Хворы то хворы, але ж і работы да чорта. Няма калі хварэць. Хаця наўрад ці за якія тры дні падлячуся.

Сяджу ў штабе адзін, а Валёк спіць, толькі што прыйшоў з Добрачы. Павел Іванавіч таксама адпачывае. Вось і ўся наша каманда. А Валёк добры хлопец. Чытаю Л. Талстога «Что такое искусство». Гэта мне дапамога ў маёй літаратурнай працы, бо я на сход партызанскіх мастакоў не забыўся. Мабыць, Смоляр ужо вярнуўся ў

міжрайцэнтр.

Сёння ўдзень было выдатнае надвор'е, таму, мабыць, і лятаў над намі нямецкі самалёт-разведчык. На Добрачы, зразумела, паніка. Аднак ён нічога не ўбачыў. На франтах становішча нядрэннае: нашы войскі ідуць уперад. Асабліва на Украіне. Заняты нашымі Ноўгарад Валынскі, які знаходзіцца каля 25 км ад былой савецка-польскай граніцы. А пазаўчора і ўчора лcraтталі савецкія самалёты, што праўда, нямнога. Але і гэта добра, што нас тут за фронтам не забываюць.

**Лагер. 08.01.1944 года.**

Яшчэ толькі 3 гадзіны ночы, а ў нашай «казарме» агонь гарыць і ў печцы паліцца. І так усю ноч. Хлопцы яшчэ спяць, а я ўжо выспаўся. І гэта самая тая пара, калі і ціха, калі спакойна можна падумаць, паразважаць, ды сёе-тое і запісаць.

Горш тое, што я ніяк папраўляюся: зубы і ногі не перастаюць балець.

Учора прывезлі параненага ў левую нагу Сашу Шулая. Яго ўзвод быў у Жухавічах, калі пад'ехалі нямецкія машыны, мабыць, з Вольна, і абстралялі нашых. Мусіць, пост не выставілі, бо ўсё знячэўку атрымалася. Цяпер ляжыць Саша ў штабе, магчыма, і косць нагі закранута. А над намі пазаўчора зноў лятаў нямецкі сцярвятнік з двума фюзеляжамі. Разведчык, усё шукае нас.

На фронце (зводка за 6.1) нашы перайшлі савецка-польскую граніцу і занялі станцыю Ракітно, што ў Ровенскай вобласці. Цікава атрымліваецца: Херсон у фашысцкіх руках, а тут, за тысячы кіламетраў, займаюць гарады. Хаця б не атрымалася так, як было з Жытомірам,

калі давялося два разы вызваляць.

Надвор'е якоесь ненармальнае: то снег з дажджом, то проста дождж. Хутка снег зусім растане. Сёння ноччу яго крыху дабавілася, дык жа з дрэў зноў капае.

**Лагер. Раніца. 09.01.1944 года.**

Зноў яшчэ ноч, бо цёмна на дварэ. Усе яшчэ спяць, але мне нельга. Я — дзяжурны па лагеры. У печцы зноў гарыць, і на ёй вада грэецца для чаю. Атрад вярнуўся з раёна, вярнуўся з перамогай. Адной нямецкай машыне «капут», 14 іх салдат забіты, адзін паранены пад левым вокам — італьянец, здаўся ў палон, а яшчэ адзін немец усё ж здолеў уцячы. Гэта помета за Жухавічы, ды і за Сашу Шулая.

Засада на машыну адбылася проста. Калі перарэзаць тэлефонную лінію паміж Баранавічамі і Мірам, дык абавязкова і хутка выязджае з Вольна машына для папраўкі яе. Так усё і было зроблена. Нашы за Жухавічамі звалілі некалькі тэлефонных слупоў і заселі. І машына з аховай — тут як тут. Тут па ёй і часанулі. Удалая засада, і вельмі шкада, што я ў ёй не прымаў удзелу.

Учора нямецкі самалёт зноў дзесьці бамбіў пушчу, туды, пад лагер Першамайскай брыгады. А на фронце нашы ідуць уперад на Украіне. Каля Чаркасаў немцаў піхнулі да самага Дняпра. Другі Украінскі фронт таксама рухаецца ўперад, Кіраваград акружаны.

Сёння правяду нараду камсамольскага актыву.

**«Дома». 12.01.1944 года.**

Я неяк дабраўся да Добрачы, у сямейную зямлянку.

Тут лячыцца буду, бо і ўрач Гофман[4] таксама тут жыве. Праўда, ноч тут неспакойная: баяцца нямецкіх самалётаў, а то выстрэлаў, маўляў, вось-вось Серафімовіч награне сюды з-за Нёмана са сваімі галаварэзамі. Учора нібыта атрад Серафімовіча, турэцкая і мірская паліцыя заняла вёскі Некрашэвічы, Лукі і Крышылоўшчыну. У Жухавічы прыбыло да 30 немцаў, каб падмацаваць ахову тэлефоннай лініі і дарогі Баранавічы-Мір. Мабыць, іх «навучыла» падбітая нашым атрадам тая машына.

А гэты палонны італьянец — мы яго назвалі Іванам — трохі балакае па-руску і з ім можна збольшага паразмаўляць. Джыаванні Дрыга — яго імя і прозвішча. Нежанаты, сам з сялянскай сям'і. У ёй было пяць братоў, два з іх загінулі ўжо на вайне, дома засталіся яшчэ два і дзве сястры. Пражывалі ў вобласці Салерна. Гаворыць, што калі б нават яго і пусцілі назад да немцаў, дык не пойдзе, бо яны яго расстраляюць. Маўляў, усіх немцаў забілі, а ён застаўся жывым. Застрэляць!

Украінскі фронт працягвае наступление: учора яго войскі вызвалілі шэсць райцэнтраў, перайшлі былую савецка-польскую граніцу у раёнах гарадоў Роёна і Сарны.

Учора атрымаў ад Царука (упаўнаважанага

---

[4]«Доктар, чарнявенькі прыгажун, аказаўся цікавым чалавекам: сын багатага прадпрыймальніка з Лодзі, ён вучыўся да прыходу Гітлера да ўлады ў Берлінскім універсітэце, быў сведкам і ахвя- рай дзікага антысемізму, дыскрымінацыі з боку фашыстоўскіх карпарантаў... Доктар Гофман канчаў медфак у Вене, куды яго і яго супляменнікаў выгнаў інстынкт нянавісці. Стаў ён тэрапеўтам вузкай спецыяльнасці — знаўся на хваробах страўніка. Фашысты злавілі Гофманаў на дарозе адступлення ў пачатку вайны, загналі ў Мір, а перад ліквідацыяй гета паслалі ў глухую вёску з наказам не дапусціць эпідэміі тыфу і іншых хвароб, якія звычай на спадарожнічаюць войнам» (Ул. Калеснік «Доўг памяці», стар. 175-176).

Платона па Стаўбцоўскім міжрайцэнтры) задание арганізоўваць антыфашысцкія камітэты ў вёсках са старэйшых людзей. Трэба ехаць на раён, хоць яшчэ і не паправіўся. Ды трэба схадзіць і ў лагер, бо калі атрад будзе выязджаць, дык трэба будзе правесці нарады з групоргамі па ўзводах.

**«Дома». 13.01.1944 года.**

Вось і яшчэ паўмесяца мінае, а там, глядзі, і месяц. Хутка бяжыць час. А сёння мінуў год, як у Лядках фашысты пamaрдавалі партызанскія сем'і і як мы, партызанскія сем'і, пачалі хавацца па чужых кутах ды кусціках. Сёння што ж?., справа зусім іншая. Ужо нашы сем'і знаходзяцца пад аховай партызан.

А мароз падскочыў нядрэнна, мабыць, як і ў тую трагічную ноч ў Лядках. Ды гэта першы такі мароз у гэтай зіме, і я рашыў ісці ў лагер. На санках мяне даганяе камандзір 2-га ўзвода Федзя Ватолін.

-- Сядай! — гукае на хаду і працягвае руку. Але я лепш захацеў пяшком прайсціся такой пагодай. Ноч марозная, але ціхая. Пад нагамі мякка ўгінаецца свежы снег. Ёлкі і сосны прыгожа і багата прыбраны снегам. Цудоўна! Цудоўна і тое, што вось у нас выраслі такія здольныя партызанскія камандзіры, якія маюць багаты ўжо вопыт партызанскай барацьбы, а значыць, і аўтарытэтныя.

-- Заўтра сход камандзірскага саставу, — кідае мне на хаду рэпліку камісар атрада, які ідзе ў супрацьлеглым напрамку. А гэта ўжо азначае, што заўтра будзе «гарачы» дзянёк. Хаця для мяне задачы на заўтра ўжо вызначаны. Давядзецца перавезці снарады для выплаўкі з іх толу, правесці нараду з камсамольцамі па арганізацыі

падрыўной групы. А што больш яшчэ? — Пабачым.

Весткі з франтоў таксама нядрэнныя. Сарны ўзяты нашымі, каля Мазыра прарваны фронт на 30 км, і нашы ўглыбіліся ў нямецкую абарону на 15 км. А на ўсход ад Пінніцы немцы пачалі контратакаваць значнымі сіламі разам з танкамі.

Смешна нават: нашага італьянца абулі ў валёнкі і надзелі шапку з авечай скуры. Цяпер ён ўжо выглядае, як сапраўдны партызан. Закончыў чытаць «Клятву», пачаў «Дзяцінства» Горкага, але спаць вельмі хочацца...

**Лагер, штаб атрада. 17.01.1944 года.**

Яшчэ ноч, хоць на нашых караўльных часах 8 гадзін ужо. Я сёння ад поўначы і дзяжурны па лагеру, і каравульны начальнік, таму не сплю, хоць на дварэ яшчэ ноч. Атрад зноў выехаў за раён, а на Добрачы прыцягнуты да варты работнікі нашай шорна-шавецкай майстэрні ды мірныя жыхары, якіх у нас ужо нямала. А ў штабе ляжыць паранены Саша Шулая, які ад ран енчыў усю ноч. Толькі вось пад раніцу крыху супакоіўся. Між іншым, ён цяпер і камандзір узвода, і наш парторг. Яму і Федзю Патоліну прысвоілі званне старшых лейтэнантаў. Не прапусцілі і іншых камандзіраў. Скажам, Сашу Пашкову прысвоілі званне лейтэнанта, Колю Савіну — малодшага лейтэнанта. А вось Мішу Карвігу знялі з камандзіра аддзялення,на што я іспадзяваўся.

Сёння маю намер правесці агульны сход камсамольцаў ды з'ездзіць у райкам камсамола. А там пара выбівацца І мне ў раён — работы ёсць да чорта.

Учора прывезлі з міжрайцэнтра свежыя газеты — «Савецкую Беларусь» і іншыя. У іх ёсць і партрэт Сталіна — у мундзіры і з пагонамі. Прывезлі таксама

патроны і аўтамат новай вытворчасці, які ўзяў камісар атрада, а свой трафейны нямецкі аддаў начальніку штаба.

На франтах (зводка ад 14.01) — вызвалены Мазыр і Калінкавічы. А ў нас — цёпла.

**«Дома». 30.01.44 года.**

Раніца. У асноўным маё «каханне» закончана, папраўкі, зразумела, будуць, я самае важнае аформіў... Асабліва мне не давалась сярэдзіна, ці мо што часу не было, абодва канцы ўжо даўно былі закончаны. Сёння вось неяк змарудзіў і сярэдзіну. Мажліва, што буду чытаць на сабранні паэтаў і пісьменнікаў партызан Мірскага р-на. Цяпер тыпаграфія ў нас свая, я ўжо ў «Голосе селяніна» надрукаваў сваю заметку «Вынікі адной засады». Другая заметка Косці Курылы (ён ужо пераведзены у падрыўшчыкі) — таксама аб маёй агітгрупе. Парадачная старонка аб нашым камандзіры. Ен вельмі задаволены гэтым. Так што цэлая старонка, палавіна нашай газеты, гэта аб нашым атрадзе. Нямала я пастараўся ў гэтым артыкуле аб камандзіры, яшчэ мае строфы «Мы любим своего командира, он друг нам, товарищ и брат, его это дело и слава, особый казачий отряд»[5].

---

[5] Ва ўспамінах былога партызана з вёскі Вензавец Дзятлаўскага раёна С. І. Лейкі (1922-2017) знойдзены такія радкі: «Немало песен и стихов сложил народ о доблести и героизме комсомольцев и молодежи этого отряда (отряд Д. Денисенко). Вот одна из них, широко известная в Мирском районе среди партизан и местного населения:
За Неманом туман подымается,
И близится солнца закат,
Рысью из леса помчался
Особый казачий отряд.
Сплотил в героический ряд,
Защиту народа доверил
Особый казачий отряд.

Пагода цяпер дрэнная: снег пошці зусім злез, дождж ішоў вот некалькі дзён падрад. Сёння ўжо сняжок ідзе. І Нёман раскрыўся ад лёду, як напрадвесне. Праўда, сёння ўжо сняжок пайшоў, але ці на доўга? Я, бадай, зноў паеду з агітгрупай на раён. Учора па гэтаму поваду быў камісар, насеўся на мяне, але я адбіўся, бо і было чым.

А мяне назначаюць у міжрайцэнтры рэдактарам раённай газеты Мірскага РК КПБ(б) «Новы Мір». Мабыць, па гэтаму пытанню і выклікалі нашага камісара ў міжрайцэнтр. Там, мабыць, і рашыцца гэтае пытанне.

Зноў у нас страта. Два дні назад у Шчорсах загінуў наш партызан Валёк Васільеў, які з «камсамольцамі»[6] ездзіў туды да сваёй дзяўчыны. Нарваліся на засаду паліцыі, разам з ім забілі і аднаго «камсамольца». Больш таго, у Валека была і фатаграфія яго каханай, якую таксама расстралялі.

---

Помнят фашистские гады
Свинец наш, «катюшин» снаряд,
Как делал на волость налеты
Особый казачий отряд.
Еремичи, Лядки и Дудки,
Где сыпались пули, как град,
Там бился с врагом не на шутку
Особый казачий отряд.
Мы любим своего командира,
Он друг нам, товарищ и брат,
Его это дело и сила...
Особый казачий отряд.
И всадник по полю несется,
И близится солнца закат.
За счастье народное бьется
Особый казачий отряд.

Аўтар гэтай песні, такім чынам, не народ, словы яе належаць Вячаславу Хілімонаву.

[6] «Камсамольцы» — гэта партызаны з атрада «Камсамолец» (у склад якога ўваходзілі мясцовыя жыхары);

Нашы войскі вядуць баі, трэба адзначыць, паспяхова, на гэты раз на Ленінградскім фронце. Вызвалены імі ўжо Краснае Сяло, Пушкін, Пецергоф, Краснагвардзейск (Гатчына), Тосна, Любань. Толькі партызан не асабліва цікавяць гэтыя падзеі, ім бы хутчэй пачаліся баі за Беларусь.

**«Дома». 08.02.44 г.**

Вечар. Гэты дзень я сустрэў як рэдактар раённай газеты «Сцяг свабоды», органа Мірскага РК КПБ(б). Быў у міжрайцэнтры, дзе аб гэтым даведаўся і дзе мне цяпер давядзецца бываць часта. Там і пазнаёміўся з такімі ж рэдактарамі Нова-Мышскай і Карэліцкай райгазет. Работа наша цяпер даволі складаная, бо і матэрыял давядзецца збіраць самому, і апрацоўваць яго, і друкаваць, і распаўсюджваць, нават збіраць паперу для газеты. Вось і давядзецца выкручвацца. А выхад майго першага нумара вызначаны прыблізна на 12-14 лютага.

З атрадам, вядома, парываць не збіраюся і ад пасады нам. камісара таксама не адмоўлюся, гэтая работа мне, канешне, дапаможа і ў рэдактарскай працы. А заўтра правяду ў сваім атрадзе нараду групоргаў па пытанні арганізацыі рэзерву партызан для нашага атрада.

Я толькі што вярнуўся з раёна, дзе быў з агітгрупай. Мая група яшчэ на раёне, таму што мост наш сарвала, няма пераезду цераз Нёман. Наша задача была гатовіць рэзервы. У Бярозаўцы я загнуў на ўсю моладзь... Цікавая рэч атрымалася — многія жэняцца, выкручваюцца сем'ямі і др. І на вёсках цяпер вельмі неспакойна. Усе баяцца, як агню, гэтых фашысцкіх «абаронных вёсак». Нашы зводкі і газеты на ляту ловяць. А тут яшчэ паведамляюць, што ў Мір, Стоўбцы і

Гарадзішча панаехалі немцы. Першамайцы ўжо ваююць з імі.

Каля Стоўбцаў загінуў Пеця Сачук, былы старшыня нашага Вялікаслабодскага сельсавета. А ў Курбанаўскі атрад перайшлі два немцы і чэх, якія раней мелі сувязь з атрадам...

Заўтра правяду сабранне груп-орг. па мабілізацыі рэзерву парт, нашага атраду. З гэтага відаць, што я ўцягнуўся ў работу сур'ёзна і па сваей спасобнасці. Сёння чытаў свой незакончаны твор. Гісторыя майго (слова «майго» перакрэслена) аднаго кахання смаляру Мазурчыку... Відаць, асабліва нецікава гэта... некаторых паназваў, што, мусіць, мала, ой мо і зусім таго не варты. Аднак у мяне не адаб'е ахвоты да пісання. Хачу гэта, як бы яно не было. Я сам разумею, што слабая рэч, а мне важная, вось чаму слабая...

**«Дома». 20.02.44 года.**

Уцёк з лагера, нягледзячы на боль горла і кашаль. Прывезлі забітага Савіна Колю. Загінуў ён 15. 2 каля спаленага маста на Сервачы. Трэба развітацца з ім.

15, 16, 17 лютага паліцыя заняла было тракт Турэц-Карэлічы-Навагрудак. 16. 2 наш атрад вёў бой за тракт з турэцкай і карэліцкай паліцыяй. Нашых 6 паранена: Кліменка, Кеда, Мікалай (гэты ўжо трэці раз), Карапыш, Ефімка, Фадзееў, Мусіенка. Некаторыя лёгка, ходзяць. Наогул, нам у гэтым месяцы не шанцуе. Віцю Шаўка, параненага ў Тудараве, немцы завезлі ў Карэлічы і там лечаць. І гэта недарэмна, бо хочуць выведаць у яго ўсе нашы сакрэты. А яшчэ Чужаўку і Валенцюкевіча раней забілі. Але ўчора ўжо паліцыі на гасцінцы не было. Іх, па зводках з гарнізонаў, 6 чалавек забіты і некалькі

паранены.

Мой першы нумар «Сцяг свабоды» выйшаў у свет 16 лютага 1944 года.

**23 лютага 1944 года.**

Я застаўся начаваць ў міжрайцэнтры, каб заўтра друкаваць свой «Сцяг». І з гэтым нумарам мне дастаецца нялёгка. Патрэбна два лісты паперы разам, каб надрукаваць загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за 23 лютага. Хацелася надрукаваць хаця б 300 экз., а ў мяне хаця б набралася паперы на 250 экз. Смоляр (рэдактар Стаўбцоўскага «Голаса селяніна» і загадчык нашай партызанскай друкарні), вопытны журналіст, назапасіў сабе такой паперы раней.

Начую ў зямлянцы камісара Камсамольскага атрада Жалезняковіча. Таму цікава будзе з ім паразмаўляць на розныя, канешне, у першую чаргу, пра нашы партызанскія справы. Ён старэйшы барацьбіт за Савецкую Беларусь, быў зняволены белапольскімі ўладамі, мог і закончыць сваё жыццё ў польскіх засценках, каб не вызваленне Заходняй Беларусі ў верасні 1939 года. Такі ж лёс склаўся і ў упаўнаважанага нашага міжрайцэнтра У. З. Царука. Аб іх, вядома, хочацца напісаць штосьці больш саліднае.

**Рэдакцыя. 24 лютага 1944 года.**

У мяне з загадчыкам друкарні непаразуменне. Атрымалася так, што ён, Смоляр, замяніў маю паперу рваных лістоў і выкарыстаў яе на сваю газету. Цяпер у мяне такой паперы застанецца не больш як на 100 экземпляраў. Я яму сказаў, што так рабіць непрыгожа, і ён зазлаваў на мяне. Нават не размаўляе са мною, і яго

падтрымліваюць работнікі друкарні — друкар Мар'ян і наборшчыца Ліза. Усе яны па нацыянальнасці яўрэі, бач, як трымаюцца адзін за аднаго! Вядома, мне без журналісцкага вопыту цяжка спраўляцца аднаму з газетай. Але зраблю!

А вось яшчэ іншы прыклад на гэтую тэму. Быў сёння ў атрадзе імя Калініна. Размаўляў з падрыўніком гэтага атрада Давыдам Плотнікам. Таксама яўрэем. Дык вось ён са сваёй групай пусціў пад адхон 7 нямецкіх эшалонаў, правёў каля 40 дыверсій. Такі прыгожы чарнявы хлапец. Сам родам з Пінска, быў мабілізаваны, але потым яго направілі ў нямецкі тыл як спецыяліста падрыўной справы. Значыць, і сярод яўрэяў ёсць розныя людзі.

Сёння зноў недзе бамбілі нямецкія самалёты ў пушчы нават блізка.

**«Дома». 5 сакавіка 1944 года.**

Наш «раён» быў паспакайнеў. А яшчэ нядаўна па вёсках Карэліцкага, Мірскага, Гарадзішчанскага і Навагрудскага раёнаў грасавала і рабавала наша насельніцтва розная фашысцкая чарната. То едуць карныя атрады «беларусаў» — Серафімовіча, то украінцы з немцамі і паліцаямі, а то вось з'явілася новае фашысцкае «цуда». Казакоў завезлі немцы на беларускія землі, каб ваявалі супраць партызанаў ды адбіралі ад беларускіх сялян апошні кусок хлеба.

На днях гэтая галодная «казачая» зграя пабывала ў вёсках і хутарах некаторых раёнаў, нават там, дзе не бывалі карнікі ў блакаду. Захапіўшы моладзь і наогул людзей, якія трапілі ім у рукі, раз'ехаліся па сваіх гарнізонах. У Навагрудку таксама стаяць гэтыя

«прославленные казаки».

Наш атрад сёння таксама выехаў, адчуваецца, што на баявую аперацыю. Адначасова выехалі і Першамайская брыгада, «Камсамолец», магчыма, I брыгада імя Жукава. Ёсць здагадка, што выехалі яны на разгром Загорскай самааховы. А мне заўтра трэба будзе ехаць у міжрайцэнтр, у друкарню, каб выпусціць свой «Сцяг», прысвечаны Міжнароднаму дню жанчын.

Год таму назад быў забіты на Ушы Міця Доська — «Мінскі». Гэта была пры мне першая страта ў людзях з нашага атрада. Талковы «мужык» быў і адукаваны — дарожны тэхнік па спецыяльнасці і адукацыі. Будаваў аўтамагістраль з цвёрдым пакрыццём Мінск-Масква, і вось дзе загінуў.

У камсамольскай арганізацыі быў агульны сход пазаўчора. Прымалі пісьмо тав. Сталіну ад імя партызан-камсамольцаў Беларусі. Вядома, у сувязі з гэтым абмяркоўвалі і спрачаліся пра камсамольскія справы нашай камсамольскай арганізацыі, асабліва пра недахопы ў ёй.

А нашы два камсамольцы — Гавіна і Бандарык з разведкі — чуць было не трапілі ў Бярозаўцы ў паліцэйскія лапы. Але Гавіна змог уцячы, а Бандарык выратаваўся, схаваўшыся ў хаце пад печчу. А Віця Шэўка, што ў палоне ў Карэліцкай паліцыі, папраўляецца. Што толькі там яго чакае? Нашы параненыя таксама тут папраўляюцца. Ефімка, Карапыш ды і Кліменка ходзяць ужо на панадворку, а Кліменка нават спрабаваў ездзіць на кані.

Мішы Араб'ю, што ў рагулеўскім батальёне, я выслаў пісьмо, каб перадаваў нам звесткі аб іх дзейнасці і намерах. Бач, ён пачаў «какетнічаць» з нашым камісарам,

з якім хоча навязаць сувязь. Што ж — няхай.

**«Дома». 06.03.1944 года.**

Загорская самаахова разгромлена, як гэта і меркавалася. Разагнаў яе ў асноўным Першы Камсамольскі атрад. А наш, які трымаў засаду ад Турца, у баі не ўдзельнічаў і да снедання вярнуўся ўжо ў лагер. Камсамольцы ж «працавалі» у Загор'і, забралі ўсе вінтоўкі, патроны, якія гэтым «самаахоўцам» выдалі немцы, нават самі людзі здавалі іх. Адна цётка, здаючы патроны, папрасіла, каб торбачку ёй вярнулі, у якой хаваліся гэтыя патроны. Многія мужчыны пыталіся, што ім цяпер рабіць, і прасіліся, каб іх забралі ў партызаны. Там забілі двух немцаў, якія камандавалі гэтай самаабаронай. Вядома, забралі і трафеі, бо гэтым немцам былі назапашаны масла, цукеркі, тытунь, нават шакалад.

Да абеда я ўжо пабываў у міжрайцентры, выпусціў загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за 5 сакавіка 1944 года.

**«Дома». 11.3.1944 года. Ноч.**

Крыху адпачываю «дома» пасля рэдактарскай працы ў міжрайцэнтры, дзе правёў тры тыдні. Выпусціў нумар газеты «Сцяг свабоды» і дзве зводкі з франтоў. Спраўляўся ўжо сам, без Смоляра, які выехаў у брыгаду імя Жукава. Усё лепш знаёмлюся з журналісцкай «хітрыкай», а райліт мне ў гэтым мала што і дапамагае, Кузняцоў — ён рускі.

6 сакавіка так званая «Беларуская цэнтральная рада» з Астроўскім як «прэзідэнтам» абвясціла мабілізацыю на Беларусі. У вёсках — бяда і гора для людзей, людзі не ведаюць, што ім рабіць, бо куды ні

кінься, усюды пагражае смерць.

Выдадзены загад і «Платона» аб мабілізацыі людзей у партызаны і без зброі. «Камсамольцы» ўжо пачалі яе: маласельцаў больш 30 чалавек мабілізавалі.

Коля Шэўка разам з групай Сашы Пашкова выкралі Віцю Шэўку з карэліцкай бальніцы. Ён ужо тут, у лагеры.

**«Дома». 16 сакавіка, 1944 года.**

Учора ноччу быў у Слабадзе. Надвор'е такое, ну, як у сакавіку і павінна быць. Падабаецца мне гэтая пара года — народзіны вясны. Але ў лесе гэтага так не адчуваецца, як там, на родных прасторах. Там ужо і жаваранкі пяюць, сонечна навокал, цеплыня. У лесе ўсё яшчэ не так.

На вёсках становішча напружанае. Здраднік Астроўскі[7] ўскалыхнуў народ. Сотні людзей, больш свядомыя, падаліся ў лес, многія дома хаваюцца, і толькі невялікая частка паслухала гэтага здрадніка і пайшла служыць фашысцкім вырадкам. Вядома, пытанне цяпер пастаўлена рабром: трэба ісці ваяваць альбо туды, альбо сюды. Адседжвацца дома, бадай, немажліва.

Паліцаі, асабліва жухавіцкія, немцы ды «казакі», трохі «гуляюць» па Карэліцкім, Гарадзішчанскім і Наваградскім раёнах. Адтуль партызанскія брыгады пераехалі ў Пушчу.

---

[7] Калабарацыяніст Радаслаў Астроўскі (1887-1976) — начальнік управы Мінскай акругі. Па ініцыятыве Кубэ 27 чэрвеня 1943 года было абвешчана стварэнне Рады даверу пры Генеральным камісарыяце Беларусі. Гэты орган уяўляў з сябе камісію, адзінай задачай якой была апрацоўка і прадастаўленне акупацыйным уладам пажаданняў і прапаноў ад насельніцтва. 21 снежня 1943 года замест Рады даверу па ініцыятыве Курта Готберга (ён стаў генеральным камісарам замест Кубэ) была створана Беларуская цэнтральная рада, прэзідэнтам якой назначылі Радаслава Астроўскага.

На Добрач перабралася шмат партызанскіх сем'яў, у іх ліку Крапіўніцкія з Бярозаўца. Іх Анюта і Ніна Шасцелікава таксама пераехалі, з якімі я дружыў. Харошыя дзяўчаты, разумныя, не балаболкі.

**«Дома». 18.III. 1944 года. Вечар.**

Сёння камісар не пусціў мяне ў райцэнтр, а тут няма ніякай работы. То групоргі раз'ехаліся, то ўзводы не на месцы. Так і хадзіў без дзела. У штабе ды ў засадах, якія засталіся ў лагеры, хлопцы ў карты рэжуцца. А мне б хацелася спакойна пачытаць ці папісаць, дык хіба ж у такім гармідары можна! Але заўтра ўсё ж выберуся ў райцэнтр.

А сёння... гэта і ёсць наш самы звычайны, «шэры», небаявы і негераічны партызанскі дзень. «Хлопцы» проста адпачываюць. А чаму б і не?! Мы ж кожны ці мо і гадзіну ходзім па мяжы паміж жыццём і смерцю.

**«Дома». 21.III.1944 года.**

Камандзір з камісарам кудысьці ездзілі з 4-м узводам на раён. Мабыць, рыхтуецца зноў нейкая баявая аперацыя, бо вечарам 2-і ўзвод выехаў на засаду ад Жухавіч. А ў атрадзе створаны пяты кавалерыйскі ўзвод. Значыць, атрад павялічваецца.

У раёне дзейнасці Першамайскай брыгады, гэта значыць, у Карэліцкам раёне, белаказакі гуляюць. Сёння разведка гэтай брыгады, якая накіроўвалася у пушчу праз нашу пераправу на Добрачы, вяла казачку з тых «белых», якая была выслана ў разведку. Дык разведчыкі нашы жартавалі, што белаказакі з бабамі ваююць.

**Казармы 2-га ўзвода. 22.III.1944 года.**

Сёння першы дзень вясны. Брыгады «Камсамолец» і імя Жукава адзначылі яго «ўварваннем» у гарнізон Мір. Гавораць, што забілі Фэста — каменданта нямецкага гарнізона ды некалькі немцаў. Падрабязнасці даведаюся заўтра, калі буду ў райцэнтры.

**Лагер. 25.III.1944 года.**

У напрамку Стоўбцаў чуваць узрывы. Гавораць, гэта бамбёжка, бо нават самалёт бачылі над Сіняўкай. На раёне пакуль ціха. Пасля таго як у Луках пазаўчора сутыкнуліся з сабою «хахлы» з жухавіцкай паліцыяй, згарэла каля 30 хат.

**«Дома». 27 сакавіка 1944 года.**

Упаўнаважаны абкома У. Царук напірае, каб стваралі мы ўжо брыгаду, але камандзір прытрымліваецца такой думкі: лепш менш, ды лепш. І ён, вядома правы. Вось і новае яго ўказанне — пашыць усім зялёныя маскіровачныя плашчы ды пілоткі. Каб не хадзілі кожны ў абы-чым, каб і выглядалі па-вайсковаму. Але галоўнае, каб лепш білі ворага.

Зводкі з франтоў радуюць. За 26.03 паведамляюць, што нашы войскі выйшлі да ракі Прут, занялі гарады Тарнаполь і Камянец-Падольскі. А Венгрыя акупавана немцамі. Падзеі, вядома, харошыя, і яны цешаць увесь наш народ.

**Лагер. 1 красавіка 1944 года. Ноч.**

Завецца захмуравецца на нашым гарызонце. У Карэлічы прыбыло 24 аўтамабілі з немцамі, якія, праўдападобна, размясціліся ў вёсках аж да Шчорсаў.

Гавораць, што і тэлефон праводзяць у гэтыя вёскі, што навокал Карэліч. Па тых жа звестках, і ў Наваградак прыбылі некалькі тысяч немцаў. А Мазурык з міжрайцэнтра (а ён у курсе звестак разведкі міжрайцэнтра) паведаміў, што на чыгуначнай станцыі высадзілася каля 20 тысяч уласаўцаў, імі камандуе нейкі Камінскі — правая рука здрадніка Уласава. Яны накіраваліся пад Дзятлава, дзе стаяць і белаказакі. Нібыта ім у дапамогу, ці мо і таму, што яны аказаліся ненадзейнымі, і сапраўды з двух гарнізонаў Гарадзішчанскага раёна ўжо перайшлі і да партызан ў гэтых гарнізонах.

Нягледзячы на такое становішча, Першамайская брыгада выехала сёння ў свой раён. На апошніх участках «нашага» партызанскага фронту зацішша. Толькі ў Некрашэвічах нейкім атрадам забіты 10 паліцаяў.

Нядаўна вярнуўся з рэдакцыі, выпусціў «Сцяг» за 31.03. У ёй змешчаны падвальны артыкул «Чорнай зграяй наляцелі крумкачы». Гэта пра напад карнага атрада Серафімовіча на вёску Лукі, і ў мяне ёсць яшчэ два такія матэрыялы: «Партызанская дружба» — пра Віктара Шэўку (як яго выкралі з карэліцкай бальніцы), і «У засценках Калдычэва» — пра лагер смерці, які расказаў мне адзін яўрэй, што ўцёк адтуль.

У міжрайцэнтр прыехалі сакратары абкома камсамола Рыбакоў і ЦК Сурганаў. Заўтра правяду камсамольскі сход, бо трэба падрыхтавацца, мо і да нас заглянуць.

Чытаў нямецкую «Правду о партизанском движении» Русанава. Звычайная нямецкая агітка. Там напісана, што ўсе партызанскія газеты і лістоўкі друкуюцца ў Маскве. Смеху варта. Толькі ж у нашай

партызанскай друкарні друкуецца пяць раённых падпольных газет. Вось яна праўда.

**7.IV.44 года. Вечар.**

Учора вярнуўся з раёна, а ноччу не спалася. Усё думалася, што вось-вось награнуць немцы з Каледзінай. Бо навошта ім лодкі, як кажуць, ды чаго шляюцца па Заполлі, Красным, Жуках і Востухаве з нейкім Тумалевічам?

Быў у рэдакцыі, але там ужо назначаны рэдактарам Кузняцоў, які раней камандаваў ці то атрадам, ці нават брыгадай «Камсамолец». Я выпусціў 10 першых нумароў «Сцяга свабоды» і нават са Смолярам па маёй задуме далі нашай раённай газеце такую назву. Бо як раней нам прапанавалі «Новы мір», Смаляр быў супраць яе, ды і я таксама. Канешне, мне неяк прыкра ад таго, што нават раней не паведамілі нічога, але мне сапраўды было цяжка спраўляцца на «два франты» — быць і нам. камісара нашага атрада, і рэдагаваць газету. Тым больш, што не на месцы пры рэдакцыі. Ну што ж, добра і тое, што нямала чаму навучыўся пры рэдагаванні газеты. Ды Дзеяў, сакаратар райкома Мірскага падпольнага, як мне перадалі, сказаў, што мяне наш камісар не хоча адпускаць з нашага атрада.

Пазнаёміўся я і з Брылём, які чытаў свае творы ў рэдакцыі. Толькі я паспеў ужо на заканчэнне. А Брыль сапраўды па знешнім выглядзе падобны да беларускага партызана, як той дзед Талаш. Хутчэй за ўсе, ён цяпер будзе дапамагаць Кузняцову рэдагаваць газету, бо той зусім слаба ведае беларускую мову.

А Добрач разрастаецца, прыбываюць новыя людзі з тых вёсак, што занялі розныя навалачы на беларускіх

землях. Узводзяцца новыя зямлянкі, нават з'явіліся і назвы такіх забудоў: плошча Свабоды, вуліца Цэнтральная, Крывы Рог. Вядома, усё гэта партызанскія выдумкі, жарты. А чаму б і не!

**15.041944 года, субота. Вечар.**

Сённяшні дзень для нашага атрада як бы гістарычны. Сёння пасля абеда на агульным пастраенні атрада быў зачытаны загад кіраўніцтва аблцэнтра, разам з ім і загад кіраўніцтва нашага атрада аб перайменаванні атрада ў першы Беларускі Казачы (мабыць, Платон хацеў назваць яго кавалерыйскім) дывізіён. У яго складзе будуць два эскадроны. У першым знаходзяцца 2-і, 3-і і 5-ы ўзводы. Камандзірам эскадрона назначаны Ватолін Федзя, камісарам — Сярдзюк Павел. У другі эскадрон увайшлі 1-ы і 4-ы ўзводы ды артылерыйска-мінамётная група. Камандзірам эскадрона назначаны Кліменка Мікалай, а камісарам — я. Камандзірам разведкі, ужо дывізіённай, застаўся Варашылаў Іван, а памочнікам — Чарадойла Сяргей. Гаспадарчы ўзвод застаўся, як і раней, таксама як і камандаванне дывізіёнам, і камандаванне атрадам. Сёння мы афіцыйна развіталіся з Асобым Казачым партызанскім атрадам, які застанецца ўжо толькі ў нашай памяці ды мо ў будучыні хто і ўспомніць у гісторыі партызанскага руху на Беларусі. На мой погляд, ён варты гэтага: баявы быў атрад.

Што ж датычыць другога эскадрона, дык камандзіры ўзводаў у ім падабраліся добрыя — Пашкоў Аляксандр, Філіпаў Васіль і Васюцінскі Мікалай. Усе прайшлі армейскую школу, таму з імі не да жартаў будзе.

А дзень сёння выдаўся халаднаваты, хаця і сонечны, і ясны. Заўтра будзе Вялікдзень, і многія з

жыхароў Добрачы пэўна ж будуць у меру сваіх магчымасцей святкаваць яго. Пэўна ж і партызаны прымажуцца да іх. Ну і што ж... Няхай, калі людзям так хочацца!

На франтах нічога асаблівага: ачышчаюць Крым, бамбілі Севастопаль, перайшлі Днестр у напрамку «Кішынёва». На нашым партызанскім фронце — цішыня. Паліцаі баяцца, каб «Міцька» не напаў на Турэц, што нібыта ён надумаў зрабіць на Вялікдзень. Але гэта хлусня. Учора ноччу ў напрамку Жухавіч быў вялікі пажар, а што і дзе гарэла — невядома. З Турца ўсю ноч стралялі паліцаі па Брачосаве, канешне, баяліся нападу.



Камандны састаў 2-га атрада 1-й БКПБ.
Злева направа: камісар В. Хілімонаў, кам.узвода А. Пашкоў, кам. атрада М. Кліменка, кам. узвода В. Філіпаў. 1944 год.

**«Дома». Ноч. 21.04.1944 года.**

Сёння ўжо змагу адпачыць у сям'і. А мінулай ноччу наш 2-І эскадрон ужо дзейнічаў самастойна пад камандай Кліменкі. Непрыемнае выконваў задание. Трэба было

забраць трупы нашых партызан з вёскі Кожава, дзе яны былі наскочылі на партызанскую засаду. Фашыстаў было 17 ці 20. Усе аўтаматчыкі і шмат патронаў няслі з сабою. Ім гэтага даюць даволі. Заселі ў дзвюх крайніх хатах і забілі нашых траіх. Васю Сукалу — былого паліцая, які перайшоў да нас, Стася Чачотку і Сашу Суздалева. Вядома, шкада хлопцаў. Вася хацеў нават паступіць у камсамол. Ён быў апошні са сваёй сям'і, якую ўсю знішчылі паліцаі. Стась жа здорава нагараваўся, калі брат яго Алік быў паранены, ён даглядаў яго. А Саша Суздалеў такі быў разважлівы хлопец, і вось іх ужо няма з намі, заўтра будзем іх хаваць.

**30 красавіка 1944 года. Ноч.**

На раёне шмат рознай сволачы бадзяецца. Праз Лукі, Асташын, Цырын праязджалі жухавіцкія немцы. Яны добра ўзброены аўтаматамі і кулямётамі. А ў Карэлічах «бясстрашныя» з новай брыгады грамілі рагулеўскі[8] батальён, адкуль «вывезлі» 25 «рагулеўцаў» і іх зброю. Нешта падобнае адбылося і ў Навагрудку, дзе дзейнічалі «золатаўцы».

А ў нас тут ідзе падрыхтоўка да святкавання Першага мая, на якім павінны быць, як абяцалі, прадстаўнікі аблцэнтра, мо і сам Платон.

Але аб гэтым ужо потым.

[8] Барыс Рагуля (1920, Турэц — 2005, Антарыё, Канада) — малодшы афіцэр войска польскага, у 1942 г. сфармаваў 68-ы карны беларускі батальён. З восені 1943 г. кіраўнік беларускага эскадрону ў Наваградку. У 1944 г. навучаўся ў разведшколе Трэцяга Рэйха «Дальвіц». Пасля вайны апынуўся ў амерыканскай зоне акупацыі. Зблізіўся са спецыяльнымі службамі ЗША. У дакументах ЦРУ праходзіў пад крыптонімам AECAMBISTA-2. Адказваў за вярбоўку беларусаў для дыверсійнай дзейнасці.

**3 мая 44 года.**

Мінулі Першамайскія святы. У гэтым годзе мы іх адзначылі тут, у пушчы. Быў партызанскі парад на Добрачы. У ім удзел прымалі: брыгада «Камсамолец», наш дывізіён і група аўтаматчыкаў не прыбыўшай яшчэ поўнасцю брыгады «Сарокіна». З неба прамежкамі свяціла сонца і лёгкія малыя бялявыя хмаркі хутка імчаліся па небе, а ў час парада сонца поўнасцю выглянула, і было прыгожа.

Агляд атрадаў рабіў У. З. Царук, потым быў зачытаны камбрыгам брыгады «Камсамолец» Р. М. Панявіным загад Вярхоўнага Галоўнага камандуючага тав. І. В. Сталіна. У ім, як і ў выступлениях Царука і Дзеева, адчувалася надзея на хуткае вызваленне. Нарэшце адбыўся і сам парад. Першай ішла пяхота з групай аўтаматчыкаў на чале, затым рушылася кавалерыя. Толькі вось чамусьці

Кліменка наш эскадрон адразу падняў «у галоп» замест пачаць рыссю. Затым адбылася рубка лазы. Тут наш камісар дывізіёна паказаў сваё ўмельства.

Закончыўся святочны дзень абедам на адкрытым паветры ў часова зробленай сталовай для ўсіх удзельнікаў святкавання і танцамі на Добрачы. Адным словам, свята было сапраўды па-савецку адзначана.

**Лагер. 8 мая 44 г. Вечар.**

Наш дывізіён, як ён цяпер стаў называцца, у поўным саставе выехаў на раён. Засады былі зроблены ў Вышкаве і Крышылоўшчыне. Першы эскадрон спярша размясціўся ў Далматаўшчыне, але на рассвеце пераехаў у Крышылоўшчыну. Я са сваім эскадронам быўу Вышкаве.

На засаду ў Крышылоўшчыне напароліся 6 немцаў з аховы тэлефоннай сувязі. Чатыры з іх адразу загінулі, прычым адзін немец з жалезным крыжам (яго цяпер для забавы вешае на сябе Пеця Карапыш), адзін нейкі Цымка здаўся ў палон, які прызнаўся, што сам забіў чатыры чалавекі рускіх. А вось адзін змог драпануць у Жухавічы. А гэты палонны немец — заядлы гад. Калі яго наш урач Гофман запытаў, чаму ён здаўся, дык адказаў, што праз памылку. Думаў, што гэта паліцаі зрабілі засаду. А калі б ведаў, што гэта партызаны, дык адстрэльваўся б да апошняга і загінуў бы разам з тымі чатырма. Сам ён падафіцэр, а калі гаворыць пра свой палон, дык слёзы круцяцца ў вачах. Гаварыў з ім і наш італьянец «Ванька», але нічога ён ад яго не даведаўся. А калі яму сказалі, што будзе спаць разам з гэтым немцам, дык наадрэз адмовіўся, мабыць, пабаяўся. Пыталі яго яшчэ, ці змог бы ён сам застрэліць гэтага немца, дык прамаўчаў.

А на наступны дзень ужо паліцыя з Жухавіч, Турца і Міра пад камандай немцаў на машынах (нібыта 8 машын было) пабывалаі ў Тарасавічах, Валетаве, Вялікай Слабадзе і Некрашэвічах. Нешта там палілі, траіх чалавек забіла, хаця ўсяго дакладна мы не ведаем.

З фронту пакуль ніякіх вестак не атрымалі.

**«Дома». 14 мая 1944 года.**

Вось зайшоў у сямейную зямлянку, бо захацелася проста пабыць, як раней, дома разам з сям'ёю. А ўчора я быў на раёне, пабываў і ў тым доме без двукоссяў. Пад'ехаў пад сваю сядзібу і ўбачыў, што нехта блукае там. Аказалася, што гэта Шура, самы малодшы з нас, братоў, гаспадарыць тут. Зайшлі з ім у наш садок, дзе я раней любіў адпачываць, і... па сэрцы рэзануў боль. Усё

такое знаёмае, роднае, але цяпер нібы і чужое. Ды яшчэ... усюды мае паперы школьныя валяюцца ды пустыя вокны і дзверы чарнеюць дзіркамі. Вось яно яшчэ адно «дасягненне» вайны! Усюды знішчэнне і смерць. І чалавечага, і маёмаснага.

Але на раёне я пабываў у іншай, больш вясёлай справе. Правяраў, як ідзе сяўба ў вёсках. Справа ў тым, што з Цэнтральнага штаба партызанскага руху Беларусі, ад Панамарэнкі, атрымана дырэктыва, у якой абавязваецца партызанам усімі даступнымі сродкамі дапамагаць сялянам як найбольш засеяць палі і абараняць іх на рабоце. Адначасова забараняецца забіраць у сялян коней і вазы для партызанскіх патрэб, нават, наадварот, прадастаўляць ім і дапамагаць сваім транспартам. Таксама аказваць дапамогу, больш эфектыўна выкарыстоўваць коней і ўсякія прылады, патрэбныя пры сяўбе паміж сялянамі. З такой дырэктывай, безумоўна, мы ўсе згодны і падтрымліваем яе.

У нашым дывізіёне выдзелены і працуюць па выкананні гэтай дырэктывы дзве камсамольскія групы. Адну з іх узначальвае Сцёпа Лейка, другую — Сяргей Чарадойла. Раён іх дзеяння — наступныя вёскі: Вялікая Слабада, Новае Сяло, Тарасавічы, Вялетава, Бярозавец, Крынкі, Некрашэвічы, Лукі. Амаль палова Мірскага раёна. Так што нашым камсамольцам даводзіцца «паваяваць» і іншай зброяй — рабочай, сялянскай. Дарэчы, колькасць камсамольцаў у нашым дывізіёне значна павялічылася, расце і партыйная арганізацыя — двух чалавек нядаўна прынялі кандыдатамі ў члены партыі, а трое яшчэ рыхтуюцца імі стаць.

У раёнах дзейнічання партызан пакуль наогул спакойна, толькі з Лідскага раёна даносяцца звесткі аб

з'яўленні там польскіх вайсковых фарміраванняў. Нібыта яны занялі Гуту над Нёманам. Мяркуюць, што гэта польскі дэсант з Англіі. Яны ваююць як супраць немцаў, так і чырвоных партызанаў. Вось якія яны нашы «саюзнічкі».

**Добрач. 17.5.44 года, Ноч.**

Зайшоў на хвілінку «дамоў», каб запісаць гэта. Вельмі ж прыгожая пара настала. Вось і весяліцца наша партызанская братва. Вечарам гучаць на Добрачы песні.

Але моладзь і ўдзень не сумуе: пачалі граць у валейбол. Адным словам, не «ўныadmin»! Але з раёнаў паступаюць і іншыя весткі...

Нібыта нядаўна створаная брыгада «25 год БССР» вяла бой з белаказакамі, якія яе здорава «патрапалі». Але і тут не падводзіць партызанскі гумар: смяюцца, што раней у гэтай брыгадзе было 25 беларусаў, а цяпер засталося толькі 15. Смех смехам, а на самой справе там пераважная большасць мясцовага насельніцтва, як кажуць, «свае хлопцы». Зноў жа ў другім месцы такія падзеі: брыгада імя Панамарэнкі пабіла каля Івянца тых белапалякаў, якімі камандуюць з Лондана. І гэта ўжо не толькі палітычнае пытанне і барацьба, але і нацыянальнае, што, вядома, на руку немцам. Але ж не мы, савецкія партызаны, яе пачыналі. Усё ідзе адтуль — з Захада. А наогул на раёне цяпер усё больш пахне анархіяй. Толькі незразумела, каму гэта выгадна. Найперш, вядома, немцам.

Але радуе тое, што небывалыя відовішчы пачынаюць «паказваць» савецкія самалёты. Так, ноччу на 17.5, як толькі сцямнела, над Баранавічамі, навакол ці ў самым Мінску былі бамбёжкі. Проста, як на свята, —

ілюмінацыя. Только вось узрывы снарадаў і бомбаў напаміналі, што гэта не свята. Гэта пекла і смерць для тых людзей, якія жывуць там. А ўчора днём ужо нямецкія самалёты ляцелі на ўсход. Што гэта? Можа, ўжо і ў нас пачалося?

**Лагер. 24 мая 1944 года. Раніца.**

Учора наш дывізіён вярнуўся з раёна ў лес. Сёння адпачываем. А там пабывалі ўсюды: на Людвіках каля Карэліч, дзе былі забіты тры паліцэйскія і адзін паранены. Затым адпачывалі ў Палужжы і Далматаўшчыне, а наш эскадрон быў ў Бурдзевічах (гэта каля 2 кіламетраў ад Жухавіч). І ніхто з гарнізонаў не адазваўся, хаця мы ж былі ў іх, як кажуць, пад самым носам. Хаця нейкая сутычка была каля Равін, але гэта дробязь. Былі і ў Луках, куды Міша Забенька, які прыехаў з пушчы, прывёз ведамасць, што нашаму дывізіёну аблцэнтрам перададзена супрацьтанкавае ружжо, прывезенае самалётам з фронту, а брыгадзе «Камсамолец» «падарылі» нават агнямёт. Ну што ж, добра і гэта. На той жа самалёт быў адпраўлены наш паранены партызан Вася Забенька на лячэнне. Вось такое ўзаемадзеянне паміж фронтам і партызанскім тылам.

Вечарам таго ж дня. Нам на тым жа самалёце шмат прывезлі новай літаратуры, нават цэнтральныя газеты, часопісы, брашуры. Сярод іх шмат беларускіх выданняў. Для прыкладу, новы часопіс «Беларусь». Я з захапленнем узяўся за яго і чытаю, не адрываючыся. Якія правільныя думкі там, акурат тое, як і я думаў і думаю. Вось некаторыя цытаты адтуль (№1 1944 год):

«Беларусь першай прыняла на сябе ўдар закаванага ў жалеза нямецкага цемрашальства. Такі ўжо гістарычны

лёс Беларусі. Можна сказаць, гэта было нашай нацыянальнай трагедыяй, што час ад часу на нашай зямлі адбываліся крывавыя падзеі еўрапейскай гісторыі.

...Можа, ніколі так востра, як цяпер, не выяўляўся вялікі сэнс і разумны прынцып савецкай дзяржаўнай сістэмы, калі цесны саюз народаў, як вечная скала, стаў непахісны перад ворагам, і калі разгром ворага на зямлі аднаго саюзнага народа ёсць перамога на шчасце другога народа».

І з гэтым, безумоўна, трэба пагадзіцца, бо тут нацыянальнае пытанне пастаўлена правільна. У супольнасці выратунак усіх савецкіх народаў. Аднак ёсць і адступленне ад гэтага, асабліва ў Заходняй Беларусі, дзе не ўсе «пласты» насельніцтва зразумелі гэта. Многія кулакі ці ўсякія іншыя «пакрыўджаныя» з буржуйскай праслойкі пайшлі і за немцаў ваяваць. Што ж, здраднікі, як бачым, не пераваяліся.

А тым часам барацьба працягваецца... І ў нас тут. Розныя яе вынікі. Вось і сённяшняй ноччу нашы партызаны з 4-га ўзвода наскочылі ў Крышалоўшчыне на паліцэйска-нямецкую засаду. Ніхто не быў забіты ці нават паранены, але, як кажуць немцы, яны «драпанулі». А гэтай ноччу ўжо нашы адпраўляюцца туды на засаду, каб адпомсціць за сваю ўчарашнюю ганьбу. І так... барацьба працягваецца.



Першы справа — Слава Хілімонаў.

**Ворагам усім наперакор. Лагер. 4 чэрвеня 1944 года.**

Учора ноччу я быў у «водпуску», г. зн. ездзіў дамоў у Слабаду. Як бы яно ні было, а пабачыцца і пагаварыць з аднасяльчанамі цікава. Даведацца пра іх настрой, як яны жывуць цяпер. Здаецца, мала што змянілася, хіба што толькі тое, што людзі сталі меньш баяцца за сябе. Жыта і іншыя пасевы ўжо вялікія, калі яны толькі ўжо выраслі? У лесе гэта, вядома, не заўважалася. Дык вось, калі што якое, у жыта з галавою і — прапаў чалавек. Пара года цяпер прыгожая, ночы цёплыя, і ўжо бэз цвіце. А сёння дык нават і горача на адкрытым месцы, хоць І вецер немалы. Аваднёў завялося да чорта, коні ад іх ледзь адбіваюцца. Ноч правёў з дзяўчатамі Валяй Х., Нінай Л. і Верай К. Харошыя дзяўчаты. І гэта яшчэ адна прыемнасць, на якую час і жыццё наша дазваляе.

Нядаўна ў нас быў даклад — нібыта прадстаўніка з Масквы — на міжнароднае становішча. Чыталася і

зводка з франтоў за 3.06.43 года. Баі ідуць на Кубані, у асноўным дзейнічае авіяцыя з абодвух бакоў. Мабыць, гэта падрыхтоўка да наступнага ўдара. Дакладчык сказаў, што наступление Чырвонай Арміі можа пачацца ў гэтым альбо наступным месяцы. Яно павінна саўпасці з ударам па Нямеччыне з захаду. Ну, што ж, будзем чакаць.

Як навіну дакладчык паведаміў, што ўсе секцыі Камінтэрна распушчаны. Задача цяпер для ўсіх камуністаў і беспартыйных адна агульная — змагацца супраць фашызму разам з самымі шырокімі слаямі грамадскасці, нават з капіталістычнымі элементамі. Значыць, класавая барацьба траціць сэнс. Можа, яно так і трэба; як дакладчык сказаў, гэтага патрабуе момант. Аднак немцы пішуць, што гэта ўжо другі ўдар па камуністычнай тэорыі: «расейская» армія, а не «чырвоная» сталі называць ва ўгоду саюзнікам.

Адносна партызан дакладчык папракнуў, што мы і брыгада імя Жукава (я яе раней называў «камсамольскай») мала займаемся дыверсіямі на чыгунцы. Абяцаў, што прышле да нас інструктара па гэтай справе, які будзе абучаць падрыўнікоў. Ці не махнуць да іх і мне — усё роўна «шалёнае» кулі чакаць усюды можна.

У час даклада ганец з Каледзінай паведаміў, што там немцы. Нашы некалькі кулямётаў і мінамётчыкі разам з камандзірам атрада паехалі туды. Цяпер яны ўжо вярнуліся назад у Шчорсы. А так жыццё ў нас ідзе сваёю каляінай, пакуль на аперацыі не выязджаем.

*Вечарам.* Адбыўся нядаўна камсамольскі сход нашага атрада. Камсамольцаў у нас сабралася ўжо нямала, чалавек каля 30. Гэта першы камсамольскі сход пярвічнай арганізацыі Асобнага Казачата Атрада. У бюро

выбралі 5 чалавек, у тым ліку і мяне. Разам з гэтым я яшчэ і адказны за дыверсійныя і «паляўнічыя» групы, Смалянка Іван — за вывучэнне зброі. Я зноў улез з галавою ў грамадскую работу. Нялёгкая гэта справа, і я поўнасцю разумею гэта.



Старонка дзённіка.

**Добрач. 9.6.44 года.**

Вечар. Сёння паліцаі і белаказакі пабывалі аж у Сіняўскай Слабадзе, перабраўшыся цераз Нёман. Ну, такого яшчэ не бывала нахабства!

«Камсамольцы» нават здорава разгубіліся, пакінулі сваю абарону. Мы з Макеем вярталіся з раёна ў атрад і ў Новым Сяле сустрэліся з эскадронам.

**15.06.44. Вечар.**

На Добрачы пакуль спакойна, і для людзей, якія схаваліся тут ад усіх наёмнікаў фашызму, яшчэ самае бяспечнае месца. Партызаны фліртуюць з дзяўчатамі, а

аматары яшчэ нядаўна гулялі ў валейбол. Але і гэта не надта супакойвае нас усіх, бо Вялікая Слабада занята белаказакамі, што не так І далёка ад нас.

**Лагер. 22 чэрвеня 1944 года.**

Учора мы толькі вярнуліся з баявога задания. 18.VI наш другі эскадрон выконваў, як гэта афіцыйна называецца, «важнае дзяржаўнае задание» пад кодавай назвай «Канцэрт». А больш канкрэтна і проста гэта быў масавы выхад партызан на падрыў чыгункі. Нашай групоўцы партызан быў вызначаны ўчастак паміж Коласавым і Негарэлым.

У нашу групоўку ўваходзілі брыгады імя Жукава і «Камсамолец» ды наш другі эскадрон, а камандаваў усімі намі камбрыг брыгады імя Жукава Васілевіч. Адначасова за намі, бліжэй да Мінска, на гэтым жа ўчастку чыгункі ўдзельнічалі ў «Канцэрце» і брыгады імя Сталіна і імя Панамарэнкі. Наш эскадрон рухаўся ўперадзе ўсёй калоны і выконваў заданні па разведцы. Праходзілі праз раён дзейнічання белапольскіх партызанаў, якія падначалены Лондану, амаль не сутыкнуліся з імі, але тыя далі «драла». А вось жыхары гэтай мясцовасці спрыяюць гэтым «белым» польскім партызанам і да нас нярэдка ставяцца не вельмі прыязна, нават паесці не даюць.

**«Дома». 26.06.44 г.**

Я прыйшоў на Добрач, «дамоў» падлячыцца, бо тут жыве і наш урач Гофман. Мабыць, прастыў на «чыгунцы», а тут і яшчэ было выкананне баявога задания. Пазаўчора я з адным узводам свайго эскадрона ўдзельнічаў сумесна з брыгадай «Камсамолец» у налёце

на самаахоўны гарнізон з так называемага «батальёна БКА[9]» ў вёсцы Любча. Усю ноч давялося сядзець у засадзе, а было халаднавата і я быў лёгка апрануты. Вось тут і адолеў мяне грып. Учора яшчэ з высокай тэмпературай «балтаўся» ў лагеры, але сёння ўрач загадаў ляжаць у ложку. Але як тут спакойна будзешь ляжаць, калі пачаліся такія цікавыя і важныя падзеі! 22.06 Беларускія франты, якіх ужо аж тры, перайшлі ў наступление, спачатку на віцебскім і аршанскім напрамках. Паведамляюць, што Віцебск ужо акружаны, а ў ім 5 нямецкіх пяхотных дывізій. Захоплены ўчастак чыгункі паміж Бабруйскам і Лунінцам, дзе рух па гэтай лініі нямецкага транспарту поўнасцю затрыманы. Заняты нашымі наступаючымі войскамі Чаўсы, Багушэўск і Сенна.

Ну ж і ночы настали! Ціхія і цёплыя па прыродных умовах, але ж вельмі неспакойныя па-людскіх справах

А вось навокал нас абстаноўка складваецца ўсё больш грозная. «Белаказакі» з занятых імі вёсак не выязджаюць, наадварот, умацоўваюцца. Учора прыбыло да іх новае папаўненне. Мяркуецца, што яны задумаюць зноў рушыць на нас у пушчу. Але ці не запозна ўжо! А для нас, партызан, цяпер вызначаны як важнейшая задача выхад на чыгунку, прычым як найбольш аб'яднанымі сіламі, так, як гэта было ў нас пад Коласавым. У тым нашым «Канцэрце», як цяпер стала вядома, рух цягнікоў быў спынены на гэтай важнейшай для нямецкага фронта чыгуначнай магістралі на 7 гадзін, а потым, калі адну

[9]БКА (Беларуская краевая абарона) — калабарацыяністцкае фарміраванне, створанае згодна з пастановай камандуючага СС і паліцыі генеральнай акругі Беларусі Курта фон Готберга ад 23 лютага 1944 года. Камандзір — Ф. Кушаль.

каляю падправілі, дык цягнікі, вядома, з ваенным грузам, ішлі «у лоб», адзін за адным. «Камсамольцы», гавораць, зноў адправіліся на падрыў чыгункі.

Сёння наведаў мяне Кліменка, прынёс новую зводку з фронта, якая нядрэнна «падлячыла» мяне. Цяпер ужо ўсё больш узнікае надзея, што ўсё ж я і наогул мы, партызаны, дажывём да дня вызвалення і нас, і ўсяго беларускага народа ад нямецкай акупацыі. А на Добрач усё больш прыбывае людзей пад нашу абарону: не менш 700 чалавек тут налічваецца па прыблізных падліках. Значыць, людзі, мірнае насельніцтва нам вераць. І ад нас чакаюць абароны. Вось яна праўда!

**Добрач. 28.VI.44 г. Ноч.**

Ну ж і ночы насталі! Ціхія і цёплыя па прыродных умовах, але ж вельмі неспакойныя па-людскіх справах. Навокал грукат і ўзрыў бомб, асвятляльныя ракеты над чыгуначнымі станцыямі і гул матораў самалётаў амаль безупынны. Вось яны, тыя ночы, якіх мы, партызаны, так чакалі, а мабыць, і чэсныя савецкія людзі, з таго трагічнага дня 22 чэрвеня 1941 года. Такая ноч у нас ужо другая.

Учора пачалася бамбёжка Баранавіч, што нам адсюль было добра відаць. Потым у напрамку Мінска І над ім, мабыць, і ў баках ад яго. І так працягвалася ўсю ноч. А вось над нашай пушчай быў збіты, канешне, нямецкім, наш савецкі самалёт. Загарэўся — і экіпаж яго загінуў, але адзін з іх, маёр Шчарбакоў, усё ж здолеў выскачыць з самалёта і прызямліўся на балоце, што яго і выратавала ад смерці. Сёння на Гідрах хавалі лётчыкаў, дык гэты маёр плакаў пры пахаванні. Выступаючы затым перад партызанамі, гаварыў, што хутка тут будзе ўжо

Чырвоная Армія і трэба збірацца ісці касіць сенакосы.

А сёння яшчэ лепш... Яно і сапраўды так: ва ўсіх напрамках лятаюць І бамбяць нашы самалёты, толькі ўзрывы ад іх бліскаюць і грукочуць.

А на франтах яшчэ лепш! Узята Орша, Бабруйск акружаны І каля яго 5 нямецкіх дывізій. Аб'яўлены ўжо Мінскі напрамак. А вось і новыя звесткі: Бабруйск і Магілёў вызвалены і яшчэ нейкія два гарады. А наш урач гаворыць, што, па сцвярджэнні англічан, гэта наступление, якое пачалося пад Віцебскам, можа закончыцца ў Берліне.

**Ускраіна леса насупраць Новага Сяла. 3 ліпеня 44 года.**

Цікавы дзень сёння атрымаўся ў нас. Сядзім тут, а побач з намі «драпаюць» немцы. Ды не абы-якія — рэгулярныя часці. Ноччу з 2 на 3.07 былі на засадзе ў Вялікай Слабадзе. Немцы ўжо групкамі і нават адзінокія «наступалі» на Захад. А Міша Кавалевіч прывёў у лагер оберяфрэйтара чэха, а сёння 17 паліцэйскіх з Карэніч перайшлі да нас, а нядаўна ўдзень каля Сіняўкі злавілі двух французаў, а аднаго немца застрэлілі. Цяпер палонныя ляжаць ля воза.

Ноччу была бамбёжка Міра і Турца, і нават непадалёк ад нас. Цяпер немцы занялі Слабаду, а іншыя перапраўляюцца цераз Нёман з Сіняўкі на Ярэмічы. А раніцай я яшчэ з 1-м узводам сустрэўся быў са злучэннем Каўпака, якое было заняло Турэц, Тарасавічы, Вялікую Слабаду, а наш першы эскадрон вёў перастрэлку з немцамі з Ярэміч, але потым давялося адступіць — вельмі ж няроўныя сілы. Цяпер 1-ы ў Новым Сяле, мы — тут. «Камсамольцы» занялі абарону на Святусе, каб не

пусціць немцаў на Каледзіную.

Учора А. Пашкоў быў назначаны камандзірам нашага эскадрона. Камісар Грэчанічанка камандуе аб'яднанай групай партызан з брыгад «25 год БССР», імя Суворава нашым дывізіёнам, а Кліменка і Шулая — яго памочнікі. Добрач у нашых руках, але ноччу чакаюцца сутычкі.

Учора «каўпакоўцы” сустрэліся з Чырвонай Арміяй. Па зводцы нашы перадавыя часці ўжо знаходзяцца ў Стаўбцах, Нясвіжы і Гарадзеі.

**Ускраіна леса. 04.07.44 года.**

Вось ужо мінулі суткі, як мы знаходзімся на адным месцы, занімаем абарону ад Сіняўскай Слабады, дзе цераз Нёман перапраўляюцца нямецкія адступаючыя войскі. Яшчэ шмат іх — рэгулярныя часці. Вядома, нам яны не па зубах, але абарону трымаем ўпэўнена. Ноч была даволі халодная, хаця нам прыходзілася начаваць тут, але трымаемся стойка.

Бамбёжкі нашых самалётаў ужо перанесены, мабыць, далей ад нас. А вось рана «каўпакоўцы» вялі бой з немцамі ў Вялікай Слабадзе, на якіх наступалі нямецкія танкі. «Каўпакоўцы» змаглі аднак замініраваць дарогі адыходу немцаў на Карэлічы і Некрашэвічы. І немцы спярша кінуліся на Карэлічы, але калі пачалі падрывацца іх машыны, павярнулі на Некрашэвічы, ды і там пачалі падрывацца, тады яны павярнулі ў Вялікую Слабаду, а за імі і пяхота. Слабаду занялі і частку «каўпакоўцаў» адрэзалі ў Бярозаўцы. Але і там на мінах падарвалася 9 нямецкіх машын, і яны адступілі. Адступілі і «каўпакоўцы», перабраліся ў лес, на Добрач. І тут ужо адпачываюць: кідаюць тол у Нёман і глушаць рыбу,

паляюць з аўтаматаў ды нярэдка заглядаюць у апусцелыя зямлянкі жыхароў, нават пабывалі і ў нашым лагеры.

Вось толькі стала вядома, што з Сіняўкі выехаў нямецкі абоз на фурманках, які ахоўваюць 15-17 коннікаў. Нашы аўтаматчыкі і падрыўнікі пад камандай А. Пашкова паехалі на засаду на іх Кашчыцаў двор. А ў Сіняўскай Слабадзе ідзе артылерыйская перастрэлка. Хто па кім страляе — невядома.

Я тут адзін застаўся камандаваць эскадронам. Пакуль што ў нас спакойна, ляжым у абароне. Ну, мая задача: накарміць людзей, выслаць і прыняць сувязных ды чакаць загаду, а калі прыйдзецца, дык і ўступіць у бой.

А навокал аж кіпіць Самалёты нібы звар'яцелі, колькі лятае іх дык ужо і не падлічыць. А вось і новыя паведамленні нашай разведкі: немцы занялі Лядкі і рухаюцца праз Ярэмічы, Вобрыну на Турэц.

Кашчыцаў двор гарыць. Але і нашы партызаны не бяздзейнічаюць. Немцаў, як разагнаных курэй, ловяць ды б'юць. А Вася Сінявін двух немцаў узяў у палон і прывёў да нас.

**Добрач. 09.07.44 года. Раніца.**

Мы вярнуліся сюды, і тут... цішыня. Нібы і вайны няма. Людзі таксама вяртаюцца ў свае зямлянкі. І ўчора быў першы дзень Савецкай улады на гэтым беразе Нёмана. Часці Чырвонай Арміі ўчора з боем вызвалілі Шчорсы, Ярэмічы, Турэц. А пад вечар па нашаму масту-плывуну пераправуляліся на той бок Нёмана чырвонаармейцы, і нават адна аўтамашына праскочыла. Потым на Добрач прыехала легкавая аўтамашына, мабыць, з якімсьці камандаваннем. Дык людзі аж з сябе

выходзілі — так іх віталі. Усім хацелася паглядзець на «нашых». Потым ноччу зноў была бамбёжка самалётамі нашай мясцовасці.

Мы ўжо асвойваліся з такім становішчам, што жывём у «акружэнні» Чырвонай Арміі. Толькі ўзнікла яшчэ адна «загвоздка». Разбітыя часці немцаў групкамі, а то і паадзіночку імкнуцца прабрацца на захад. Здараецца, што яны нападаюць на сямейныя лагеры. Відаць, таму, што галодныя, як ваўкі. Так было ў атрадзе Зорына, дзе нібыта чалавек 15 забілі ці паранілі. Ды і ў нас здараюцца выпадкі нападу такіх «ваўкоў» на мірных жыхароў. Наш дывізіён пераходзіць на барацьбу па знішчэнні такіх «бегляцоў» і наогул фашысцкіх «элементаў». А ў нас некаторыя «васточнікі» ідуць у Армію, каб працягваць свой баявы шлях, пачаты ў 1941 годзе. А цяпер я іду ў штаб на сход.

**Лагер. 11.07.44 года.**

Мы робім аблавы. Так так, іменна аблавы, на немцаў. Учора пачалося на пасту № 2 ад выстралаў там, і мы злавілі двух немцаў. Цяпер іх у нас толькі ў 3-м ўзводзе 23 чалавекі. А так цэлую ноч навокал толькі і чулася страляніна — стралялі па немцах, паліцэйскіх, белаказаках, ды бог ведае яшчэ па кім! Каго толькі немцы не валаклі сюды!

А мне ўспомнілася іншая такая пара — мінулагодняя. Тады па нас стралялі немцы і ўсякія іншыя іх хаўруснікі з усіх сухіх месц у пушчы. А мы былі і галодныя, і халодныя. Цяпер жа ўсё перавярнулася, усё наадварот. Цяпер немцы паўзуць па балотах галодныя і абарваныя, аброслыя і... нясмелыя. Учора два нашы разведчыкі ўзялі ў палон 16 такіх «недабіткаў». Вось яна

тая хвалёная «непераможная» гітлераўская армія. Толькі з «нашай» смяяліся ў сорак першым.

Паведамляецца, што вызвалены Навагрудак, Баранавічы, Вільня.

І ў нас працягваецца барацьба. Не абыходзіцца без ахвяр і з нашага боку. Іх афіцэры не так ужо і здаюцца. Пры пагоні за кучкай іх былі застрэлены нашы партызаны Пеця Карапыш, Сяргей Антаненка і Максім Шастак. Вельмі шкада хлопцаў — загінулі ўжо вольнымі людзьмі. І гэта напамінак: вайна яшчэ не закончылася.

Вечарам прыязджаў да нас маёр Чырвонай Арміі, каб забраць з ліку палонных, як ён назваў, «штурмавікоў». Гэта яны першымі пойдуць перад нашымі салдатамі на штурм нямецкіх абарончых кропак. Навучыліся і «нашы» хітрыць. Адабраў 15 чалавек былых паліцаяў і «пагуляўцаў», якіх перадалі нам з Сувораўскай брыгады, а сярод іх і Мішу Араб'я, які быў нібыта сувязным з нашым «асабістам» Шэўкам Міколам. Брат Міколы, Віця Шэўка, які паранены ляжаў у карэліцкай бальніцы, непрыязна адклікаецца пра Мішу Араб'я, бо ён яго тады папракаў, маўляў, за каго ты ваюеш? За жыдоў! І, маўляў, пераходзіць да немцаў. Вось такі ён «сувязны», а цяпер, канешне, будзе на гэта спасылацца. І яго пакінулі, а яго брата Шуру адправілі разам са «штурмавікамі». З ім пайшлі і іншыя нашы палонныя, засталіся толькі два французы і наш «Ванька».

Ёсць прапанова арганізаваць з ліку «камсамольцаў» і нашага дывізіёна знішчальны батальён, у які ўвойдуць чатыры нашы конныя ўзводы. Пяты наш узвод паехаў разам з Чырвонай Арміяй. Але гэта яшчэ няпэўна. А камісар Грэчанічанка нібыта збіраецца ісці на фронт да свайго былога камандзіра, а цяпер генерала Пліёва.

Наогул жа ўжо многія думаюць пра работу ў мірных умовах. Ці не ранавата толькі?!

**Лагер. 12.07.44 года.**

Сёння мы збіраемся выязджаць з леса, пакуемся на вазы. А 4-ы ўзвод займаўся пахаваннем кулямётчыка Паўла Сініцы, які загінуў пры сутычцы з групай нямецкіх афіцэраў. Цяпер наогул на Добрычы стала жыць небяспечна. Разбіткі нямецкіх часцей каля Мінска ўсё яшчэ прабіраюцца лясамі на захад. Вядома, галодныя. Таму нападаюць на людзей, дзе змогуць.

Вось так, мабыць, і закончыцца, нашы партызаны часценька і забіваюць іх. Таму людзі адсюль ужо ўцякаюць у вёскі — там спакайней. Тым больш, калі партызаны выедуць адсюль.

*Дзённік I фотаматэрыялы прадастаўлены Карэліцкім раённым краязнаўчым і Навагрудскім гісторыка—краязнаўчым музеямі*

*Часопіс «Маладосць» выказвае падзякі галоўнаму захавальніку фондаў Навагрудскага гісторыкакраязнаўчага музея Ганне Туровіч, галоўнаму захавальніку фондаў Карэліцкага краязнаўчага музея Віталю Смалянку, пісьменніцы Ірыне Шатыронак, ВадзімуХілімонаву, начальнику прэс—службы Гродзенскага аблвыканкама Віктару Железняковічу, намесніку старшыні Карэліцкага райвыканакама Руслану Абрамчыку, галоўнаму рэдактару газеты «Полымя» Іне Лейка, былому карэспандэнту газеты «Полымя» Станіславу Луку, намесніку дырэктара па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Ганне Гілінскай.*

*Уступнае слова і каментарыі Ірыны Шатыронак*

## Пра аўтара дзённіка

Вячаслаў Хілімонаў нарадзіўся 14 чэрвеня 1920 года ў горадзе Кірсанаве Тамбоўскай вобласці, з пяці дзяцей быў малодшы. Калі выдавалі пасведчанне аб яго нараджэнні, беларускае прозвішча Хілімон перайначылі на рускі манер: Хилимонов. У 1922 годзе беларуская сям'я вярнулася на радзіму — у вёску Вялікая Слабада цяперашняга Карэліцкага раёна.

У Вялікай Слабадзе Вячаслаў скончыў школу, да 1939 года вучыўся ў тэхнічнай школе ў Вільні. Падчас акупацыі вясной 1942 года разам са старэйшым братам Яўгенам пайшоў у партызанскі атрад. Быў камсоргам, потым камісарам 2-га атрада 1-й Беларускай кавалерыйскай брыгады пад камандаваннем Дзмітрыя Анісімавіча Дзенісенкі, больш вядомага як Міцька.

Пасля расфарміравання брыгады ў ліпені 1944 года ўдзельнічаў у гістарычным вызваленчым паходзе на Захад у складзе 38-га асобнага пагранічнага Чырвонасцяжнага ордэна Суворава палка Першага Беларускага Фронту, вызваляў польскую сталіцу і іншыя польскія гарады і мястэчкі, штурмаваў Берлін, сустракаўся з саюзнікамі на Эльбе.

Узнагароджаны баявым ордэнам «Великая Отечественная война 2-й степени», медалямі «Партизану Отечественной войны», «Медаль за освобождение Варшавы», «Медаль за освобождение Берлина», у пасляваенны час атрымаў «Медаль Жукова».

Пасля вайны працаваў журналістам у рэдакцыі карэліцкай газеты «Полымя». У 1962 годзе паступіў вучыцца на завочнае тэатразнаўчае аддзяленне Беларускага тэатральнага інстытута. У 1970-я напісаў п'есы «Ружа Панямоння» (пра партызан) і «Апошні князь» (на гістарычную тэму), а таксама кінасцэнарый. Друкаваўся ў рэспубліканскай прэсе. У 1990 годзе ў выдавецтве «Полымя» (Мінск) выйшла яго кніга «Мірскія былі».

Расказвае Вадзім Хілімонаў — сын Вячаслава Хілімонава, жыхар пасёлка Мір:

— У ліпені 1944 года бацьку пакінулі на камсамольска-партыйнай рабоце ў пасёлку Мір, але неяк яго выклікалі на

пасяджэнне, дзе прысутнічалі Дзмітрый Дзенісенка, начальнік разведкі Міхаіл Навіцкі, іншыя партызаны. За сталом сядзеў маёр НКУС, перад ім ляжала папка — справа Хілімонава. Камандзір даў маладому камуністу, партызану добрую характарыстыку. Тады не пыталі згоды, мабілізавалі яго радавым у 38-ы асобны пагранічны полк. Бацька добра ведаў польскую мову, вучыў нямецкую. Дэмабілізаваўся з арміі толькі ў 1947 годзе, апошняе месца службы — Патсдам. Бацька не любіў успамінаць пра вайну.

У 1995-м, напярэдадні свайго 75-годзя, Вячаслаў Хілімонаў паклаў на паперу такія радкі: «Вось напісаў апошні сказ успамінаў-споведзі, паставіў у канцы кропку... і задумаўся: для чаго гэта ўсё пісаў? Ці патрэбна гэта людзям? Маё жыццё — гэта мая асабістая справа. Але падумалася і іншае. Я як грамадзянін належу пакаленню дваццатых-трыццатых-саракавых гадоў, на долю якіх выпала нямала бед, але і шмат гераічнага. Вось і хочацца, каб пра гэта ўсё не забылі нашчадкі... А я пражыў чэсна, нікога не крыўдзіў, таму кожнаму чалавеку магу смела глядзець у вочы”.

Вячаслаў Хілімонаў памёр І999года, пахаваны ў пасёлку Мір Карэліцкага раёна.

Матэрыял сканаваны з часопіса “Маладосць”. 2018. № 5. С. 116—141.